Камуністычная партыя бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 8 1932 г. № 176 (4428).

Год выданьня XV

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—За бальшавіцкую перабудову прамкаапэрацыі. ГРЫНЕВІЧ—Захват мытняў і пошты ў Манчжурыі (2 стар.).

АБ ВЫНІКАХ СТАЛІНСКАГА ПАХОДУ І АБ ЗАВОДЗКІХ ХАРЧОВЫХ КАНФЭРЭНЦЫЯХ—Пастанова ЦК КП(б)Б (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ — Забытыя абяцаньні. (3 стар.).

Кожны дзень зацягваньня поліва і ўборкі агародаў пагражае нам стратамі тысяч тон гародніны (1 стар.).

Вопыт армавірскіх калгасьнікаў—на палі Савецкай Беларусі (2 стар.).

Патокі прамтавараў насустрач ураджаю. (3 стар.).

Разгортваньнем шырокай растлумачальнай работы на вёсцы—забясьпечыць пасьпяховую рэалізацыю пазыкі спрод адпасобнікаў (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Крывавая хваля фашысцкага тэрору ў Германіі (4 стар.).

Паўстаньне ўкраінскіх сялян у Лідзкім павеце (4 стар.).

Усеагульная забастоўка камунальных рабочых у Львове (4 стар.).

За бальшавіцкую перабудову прамкаапэрацыі

«Трэба ўсімі мерамі падтрымаць і разьвіць прамысловую каапэрацыю, аказаць ёй усялякую садзейнасьць, гэта—абавязак партыйных і савецкіх работнікаў, бо гэта адразу дасьць палягчэньне сялянству і палепшыць яго становішча». Так пісаў Уладзімер Ільліч Ленін у 1921 годзе пры ўвядзеньні новай эканамічнай палітыкі.

Чаму Ленін завастраў тады ўвагу партыі і ўраду на неабходнасьці разьвіцьця прамысловай каапэрацыі? Таму, што гэтага патрабавала гаспадарчае становішча краіны. Пасьля замены развёрсткі харчпадаткам селянін атрымаў магчымасьць і зацікаўленасьць разьвіваць сваю гаспадарку ня толькі для поўнага задаваленьня асабістых запатрабаваньняў, але і збываць лішкі прадукцыі на шырокі рынак. Каб зацікаўленасьць селяніна ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі яшчэ больш павялічыць і гэтым самым узмацніць паток с.-г. прадуктаў і сырцу з вёскі ў горад, яму (селяніну) трэба было даць прамысловых тавараў і ў першую чаргу шырокага спажываньня.

Зруйнаваная за гады імпэрыялістычнай і грамадзянскіх войнаў лёгкая прамысловасьць задаволіць поўнасьцю попыт селяніна не магла. На яе аднаўленьне патрабавалася некалькі год з вялізарнымі капіталаўкладваньнямі. Аднаўленьне-ж і разьвіцьцё прамысловай каапэрацыі патрабавала значна меншых сродкаў і часу. Між тым, асартымэнт яе прадукцыі ў поўнай меры адпавядае запатрабаваньням селяніна. **«Прамысловая каапэрацыя,**—пісаў Ленін,—**дапаможа разьвіцьцю дробнай прамысловасьці, што павялічыць колькасьць неабходных для сялян прадуктаў, якія не патрабуюць у большай частцы ні далёкага падвозу па чыгунцы, ні буйных фабрычных прадпрыемстваў».**

Праводзячы няўхільна гэтыя ўказаньні Леніна ў жыцьцё, партыя на працягу ўсяго пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва аддавала вялізарную ўвагу пытаньням разьвіцьця прамысловай каапэрацыі. Узяўшы цьвёрды курс на сацыялістычную індустрыялізацыю краіны, партыя адначасова рабіла ўсё магчымае для разьвіцьця лёгкай прамысловасьці. Мы ня толькі поўнасьцю аднавілі і рэканструявалі старыя прадпрыемствы, але і пабудавалі сотні новых тэкстыльных, швэйных, трыкатажных, абутковых і іншых фабрык.

Усё гэта ў многа раз павялічыла фонд прамысловых тавараў шырокага спажываньня для снабжэньня рабочых і працоўнага селянства. Але ўсё гэта далёка не задавальняе тіганцкі, ўзросшых за апошнія гады запатрабаваньняў працоўных мас, у тым ліку калгасьнікаў і сялян-аднаасобнікаў—сераднякоў і беднякоў. Вось чаму, разгортваючы праводзячы палітыку на далейшую індустрыялізацыю краіны, партыя ўзмацняе сваю ўвагу да разьвіцьця лёгкай індустрыі. Вось чаму роля прамысловай каапэрацыі на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва ня толькі не зьмяншаецца, але яшчэ больш павялічваецца, асабліва ў сувязі з разгортваньнем калгаснага гандлю.

Каб узмацніць паток с.-г. прадуктаў на савецкія рынкі, у вёску трэба накіраваць сустрэчны паток прамысловых тавараў шырокага спажываньня. Вырашэньне гэтай важнейшай праблемы ў значнай ступені залежыць ад работы прамысловай каапэрацыі, якая павінна адыграць вялікую ролю ў мабілізацыі і выкарыстаньні ўсіх унутраных рэсурсаў і магчымасьцяй.

У БССР прамысловая каапэрацыя ў сваім разьвіцьці мае буйныя дасягненьні. Яе прадукцыя расьце з году ў год. У 1928-29 годзе выраблена тавараў на 44.137 тыс руб.; у 1929-30 годзе—на 81.471 тыс руб.; у 1931 годзе—на 130.927 тыс. руб. Плян 1932 году запраектаваны ў суме 228.620 тыс. руб. плюс 90 млн. руб. па дадатковай праграме.

Расьце таксама лік прамысловых арцеляй і каапэраваных саматужнікаў. Калі на 1 верасьня 1928 году па ўсёй БССР было 617 арцеляй з 10.957 пайшчыкамі, дык на 1 студзеня 1932 году арцеляй налічвалася 1245, пайшчыкаў—46.228.

Але ці можам мы сказаць, што наша прамкаапэрацыя поўнасьцю выкарыстоўвае усе магчымасьці для павялічэньня вырабу тавараў шырокага спажываньня? Не, гэтага сказаць нельга. Нельга таму, што яна яшчэ зусім невыстарчальна перабудавала сваю работу на аснове ўказаньняў тав. Сталіна, не разгарнула бальшавіцкай барацьбы за максымальнае выкарыстаньне ўсіх прамысловых адкідаў.

Апублікаваная нядаўна пастанова ЦВК і СНК Саюзу ССР «Аб перабудове работы і арганізацыі форм прамкаапэрацыі» адкрывае перад апошняй новыя, яшчэ большыя магчымасьці.

Першая з іх — гэта стварэньне ўласнай сырцовай базы, шляхам разгортваньня самазагатоўчых апэрацый. Згодна пастановы, прамкаапэрацыя мае права бесспэрашкодна, паўсюдна зататаўляць для патрэб сваёй вытворчасьці розныя віды сырцу, апрача бавоўны, ільну, пянькі, воўны, шаўковых коканаў і скуры, загатоўка якіх можа рабіцца ў кожным паасобным выпадку з санкцыі камітэту па загатоўках пры СПА. На самазагатоўку сырцу—рашаючага зьвяна ва ўзьняцьці прадукцыйных сіл прамкаапэрацыі—трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу. Прамкаапэрацыя павінна ва што-б та ні стала пашырыць сваю сырцовую базу за лік мясцовага і недэфіцытнага сырцу.

Другая, новая магчымасьць, якая мае вялізарнае значэньне для разгортваньня прадукцыйных сіл прамкаапэрацыі, заключаецца ў тым, што прадукцыю з сырцу сваёй загатоўкі арцель саматужнікаў мае права прадаваць па цэнах, што складаюцца на рынку. Сыстэма цэнтралізаваных абавязковых зказаў таксама скасоўваецца.

Важнейшым мерапрыемствам па перабудове прамысловай каапэрацыі зьяўляецца максымальная дэцэнтралізацыя яе работы і ліквідацыя лішніх зьвеньняў. Арцель самастойна распараджаецца ўласнымі зваротнымі сродкамі і маемасьцю. Скасоўваецца практыка абавязковых адлічэньняў на ўтрыманьне вышэйшых зьвеньняў.

Такім чынам магчымасьці, прадастаўленыя ўрадам прамкаапэрацыі, надзвычай вялікія. Але для ператварэньня іх у жыцьцё патрабуецца вялікая арганізацыйная работа з боку ўсёй партыі, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

ЦК УсеКП(б) прапанаваў усім партарганізацыям «прыняць актыўны ўдзел у перабудове работы органаў прамысловай каапэрацыі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на апэрацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне арцеляў і таварыства; разьвіць вакол пастановы ЦВК і СНК СССР неабходную масава-растлумачальную работу і забясьпечыць паўсюдны кантроль за ходам выкананьня гэтай пастановы».

Такаво вялізарнае значэньне, якое партыя і ўрад надаюць прамысловай каапэрацыі. Яна ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ня толькі дапамагае буйнай прамысловасьці ў вырашэньні праблемы павялічэньня вырабу тавараў шырокага спажываньня, але і зьяўляецца адзіным шляхам да сацыялізму для саматужніка і дробнага вытворцы. У адрозьненьне ад капіталістычных краін, дзе дробны вытворца асуджан па нямінучае зруйнаваньне і пагібель, у нас, у СССР, саматужнікі уключаюцца ў агульны паток сацыялістычнага будаўніцтва, усямерна палепшаць сваё становішча.

Трэба адзначыць, што многія работнікі, нават камуністы, недаацэньваюць значэньня прамысловай каапэрацыі, адносяцца з нагардаю да яе работы, праяўляюць «лявацкае» яе ігнараваньне. Думаць, што ў краіне, дзе будуюцца магутныя гіганты індустрыі, прамкаапэрацыю, як дробную саматужную вытворчасьць, можна зусім адкінуць і не аддаваць ёй ніякай увагі — значыць глыбока памыляцца, не разумець сутнасьці прамысловай каапэрацыі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту і тэй ролі, якую яна адыгрывае ў будаўніцтве сацыялізму. Прамысловая арцель павінна пя толькі змагацца за павялічэньне тавараграга фонду краіны, але і перавыхоўваць сваіх членаў-саматужнікаў, узьнімаць іх сьвядомасьць да ўзроўню актыўнага будаўніка бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

ЦВК і СНК СССР у сваёй пастанове абавязалі прамысловую каапэрацыю аказаць усякую садзейнасьць неарганізаваным саматужнікам-адзіночкам, як па лініі снабжэньня іх матар'яламі, так і ў збыце прадукцыі. Гэта ўказаньне мае вялізарнае значэньне для разгортваньня вырабу тавараў шырокага спажываньня, асабліва рамонтных апэрацый, якія ў сучасны момант зьяўляюцца адным з важнейшых сустаўных частак барацьбы за шырспажыў. Адначасова трэба прыняць усе меры да выкараненьня прыватнікаў, спэкулянтаў і перакупшчыкаў саматужнай прадукцыі, вядучы рашучую барацьбу з прояўленьнямі спэкуляцыі ў паасобных зьвеньнях прамкаапэрацыі.

Прамысловая каапэрацыя і некаапэраваныя саматужнікі—вялікая прадукцыйная сіла. Яна ўваходзіць у агульны плян росту прадукцыйных сіл краіны ў другой пяцігодцы. У рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі па дакладах т. т. Молатава і Куйбышава наконт гэтага выразна запісана: «Па лініі саматужнай прамысловасьці—прамкаапэрацыі—значна ўзмацніць выраб прадметаў шырокага спажываньня і разгортваньне прамыслаў і вытворчасьцяй, якія абслугоўваюць сацыялістычную прамысловасьць і сельскую гаспадарку на аснове поўнага каапэраванага ахопу дробнай саматужнай прамысловасьці». Пастанова ЦВК і СНК СССР па перабудове прамкаапэрацыі — буйны крок па рэалізацыі пастаноў партканфэрэнцыі. Хутчэйшае правядзеньне яе ў жыцьцё—важнейшая задача ўсіх партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафсаюзных арганізацый.

10 жніўня, у 6 з палоўю гада. вечара, у летнім тэатры саду „ПРАФІНТЭРН"

скліканецца

пашыраны пленум менскага гаркому КП(б)Б

разам з гарпартактывам, ударнікамі друку, рэдакцыямі цэнтральных і фабрычна-заводзкіх газэт і рабочымі арганізацыямі.

ПРЫСЬВЕЧАНЫ 15-ГОДЗЬДЗЮ „ЗЬВЯЗДЫ".

Пленум праводзіцца як агульна-гарадзкі партыйны дзень, а таму прапануецца ўсім трохкутнікам прадпрыемстваў і устаноў назначаныя імі на 10-VIII усялякія бяз выключэньня пасяджэньні адмяніць.

Члены ЦК і ЦКК, гаркому і гарКК праходзяць на пленум па сваіх мандатах.

Сакратаром парткалектываў і ячэек атрымаць білеты на пленум 8, 9 і 10 жніўня у гаркоме КП(б)Б пакой № 24.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

КОЖНЫ ДЗЕНЬ ЗАЦЯГВАНЬНЯ ПАГРАЖАЕ НАМ СТРАТАМІ ПОЛІВА І ЎБОРКІ ГАРОДАЎ ТЫСЯЧ ТОН ГАРОДНІНЫ

Рабочая грамадзкасьць павінна аказаць безадкладную дапамогу гародам

Не зацягваць уборку гародніны

Прыгарадныя гаспадаркі ўступілі ў самы адказны пэрыяд сельска-гаспадарчых работ. Набліжаецца ўборка гародніны, якая акрэсьлівае рэзультаты ўсяго сельска-гаспадарчага году.

Ураджайнасьць агародаў і выхад таварнай прадукцыі ў значнай ступені залежыць ад пасьляслясўбовай апрацоўкі палёў — поліва.

Поліва па БССР агародныя гаспадаркі павінны былі скончыць да 1 жніўня. На справе-ж плян поліва выканан на 65,5 проц. Белкаапсельаб'яднаньне і паасобныя дырэкцыі саўгасаў не паставілі ў цэнтр сваёй увагі барацьбу са стратамі, барацьбу за ўзняцьце ўраджайнасьці.

Так, **віцебскія гаспадаркі плян поліва выканалі на 52,8 проц., гомельскія — на 60 проц., а менскія — на 74,6 проц.** Рад паасобных гаспадарак маюць зусім мізэрны процант выкананьня поліва. Напрыклад, віцебская прыгарадная гаспадарка ТСТ выканала плян поліва на 19,7 проц., саўгас **«Новы сьвет»** — на 49 проц., полацкае ТСТ — на 25 проц. Такіх прыкладаў можна прывесьці яшчэ шмат.

Гарадзкія прафарганізатары аказалі невыстарчальную дапамогу калгасам у правядзеньні поліва.

Другой важнейшай задачай зьяўляецца падрыхтоўка і правядзеньне ўборкі раньняй гародніны. Ход уборкі паказвае, што прыгарадныя гаспадаркі пачалі яе непадрыхтаванымі. Напрыклад, па сыстэме Белкаапсельгасаб'яднаньня патрэбна на 6.620 тон гародняхавальняў, падрыхтавана-ж па 4.620 тон. З патрэбных 25.000 бочак ёсьць 4.800.

Назіраюцца выпадкі, калі Белплодагародніна з-за адсутнасьці тары ня прымае гуркоў. Напрыклад саўгас **«Зялёны луг»** 4 жніўня цэлы дзень вазіў па Менску гуркі ад адной арганізацыі да другой, але ніхто іх не хацеў прыняць, бо няма ў чым саліць.

Рабочай сілай прыгарадныя гаспадаркі забясьпечаны няпоўнасьцю. Паводле пляну для ўборкі гародніны на жнівень патрэбна 190.000 чалавека-дзён, ёсьць-жа 112.000. Па менскіх прыгарадных гаспадарках не хапае 5.100 чалавека-дзён. Недахват рабочай сілы тлумачыцца няўменьнем правільна скарыстаць тых рабочых, якія ёсьць, неарганізаванасьцю грамадзкага харчаваньня. З прычыны неналаджанасьці дастаўкі абедаў непасрэдна на поле, рабочым прыходзіцца хадзіць па некалькі вёрст.

Белкаапсельгасаб'яднаньне ня здолела мабілізаваць масы рабочых па разгортваньне праполачна-ўборачных работ. **Характэрна, што Белкаапсельгасаб'яднаньне ня ведае нават, як ідзе ўборка раньняй гародніны.** Уліку ўборкі няма.

Далейшае зацягваньне ўборкі гародніны пагражае нам вялікімі стратамі. Дарагі кожны дзень. Каапэрацыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, трыкутнікі каапгасаў павінны мабілізаваць усю грамадзкасьць на ліквідацыю адставаньня ў праполачна-ўборачай кампаніі. Перадавыя прадпрыемствы павінны дапамагчы каапгасам і перанесьці з цэхаў на палі свае сацыялістычныя мэтады працы. Кожны рабочы і служачы павінен памятаць, што ад своячасовага поліва і правядзеньня ўборкі будзе залежыць забясьпечэньне пралетарскіх цэнтраў гародніной.

Я—г.

Гароды саўгасу імя Лекерта зарасьлі бур'янам

Перад саўгасам імя Лекерта пастаўлена адказьнейшая задача — забясьпечыць своячасова магазыны і сталовыя ЗВК добраякаснай і сьвежай гародніной.

Вясной саўгас засеяў 163 гэкт. гародніны і 173 гэкт. палявых культур. Але выканаць пасеўны плян, гэта толькі пачатак барацьбы за ўраджай і здачу таварнай прадукцыі.

Калі паглядзець, як саўгас выконвае здачу прадукцыі, то малюнак атрымаецца зусім нішчымны. У другім квартале ня здана 120 цэнт. салодкай цыбулі, 60 цэнт. салаты, 150 цэнт. гуркоў і інш. Сёньняшняе становішча гароду не дае ніякай гарантыі, што і надалей плян будзе выканан.

З засеяных 20 гэкт. гуркоў, 8 ужо перарана. 10 гэкт. морквы загінулі таму, што ні разу ня былі праполаты. Такое-ж становішча з іншымі культурамі. Са 104 гэкт. на 5 жніўня было праполата ў першы раз толькі 40. На гэтым поліва спынена. Значная частка гароду (гуркі, капуста, морква і інш.) заглушана пустазельлем.

Паводле слоў агранома Лютарэвіча, усе культуры прарыхлены адзін раз і ачуканы па два разы. Але на пасевах гэтага ня відаць, глеба амаль нічым не адрозьніваецца ад папару. Расьліны заглушаны скарлупой верхняга пласту і патрабуюць частага рыхленьня.

Слаба рыхтуецца саўгас і да масавай уборкі гародніны. Транспарт для перавозкі не падрыхтаваны. Дырэкцыя спадзяецца, што ўсё будзе перавезена гарадзкімі аўтамашынамі. Для засолкі гародніны не хапае тары, аб якой дырэкцыя таксама не клапоціцца. Назіраецца шмат выпадкаў раскрадваньня гародніны на полі. Дырэкцыя пра гэта ведае, але ніякіх мер ня прымае.

Асноўнай прычынай такога становішча калгасу зьяўляецца тое, што трыкутнік ня здолеў арганізаваць апэрацыйнага кіраўніцтва гаспадаркай. Партыйныя сілы на адказьнейшых вучастках гаспадаркі не расстаўлены. Парт'ячэйка не павярнулася тварам да вытворчасьці.

Са 113 пастаянных рабочых, 50 проц. кемцаў, якія ня ведаюць беларускай мовы. Сярод іх ніякай растлумачальнай работы не праводзіцца. Гэта адмоўна адбіваецца на прадукцыйнасьці працы.

6 умоў тав. Сталіна не знайшлі належнага праламленьня ў рабоце саўгасу. Пытаньнямі палепшэньня добрабыту рабочых ні дырэкцыя, ні парт'ячэйка ня цікавяцца. Рабочыя забясьпечаны кватэрамі ня больш як на 50 проц. Ня гледзячы на ізяўнасьць усіх умоў, грамадзкае харчаваньне не наладжана, якасьць абедаў нізкая, у сталоўках бруд і антысанітарыя.

Паміж вядучай групай і астатнімі рабочымі як у зарплаце, так і ў забясьпечэньні ніякай розьніцы няма. Заработная плата падагнана пад адну рубрыку — жанчына атрымлівае ад 50 да 60 руб., мужчына — ад 70 да 80. У выніку наглядаюцца частыя навыхады паасобных рабочых на работу, цякучасьць рабочай сілы і зьніжэньне прадукцыйнасьці працы. Налўная рабочая сіла як належыць не скарыстоўваецца. Са 113 штатных рабочых, на полі працуе толькі 70. Зьдзельшчына ўведзена ў саўгасе фармальна. Паводле слоў бухгальтара, на зьдзельшчыну пераведзены сэзонныя рабочыя, а пастаянныя працуюць падзённа.

У значнай меры віну за правал поліва ў саўгасе трэба ўскласьці на некаторыя прадпрыемствы і ўстановы Менску. Так, фабрыка «Усход», заключыўшы дагавор на 3.000 працадзён, адпрацавала толькі 300. Ня лепш дапамаглі саўгасу БДУ, групком мэталістаў і інш. З 5.400 працадзён у саўгасе адпрацавана 1.283 дні.

Такога становішча падалей нельга цярпець. Трыкутнік саўгасу, замест таго, каб прыкрываць сваю бязьдзейнасьць аб'ектыўнымі прычынамі, павінен зараз-жа мабілізаваць усю сілу і ачысьціць гарод ад пустазельля. Гарнрафсавет павінен дапамагчы саўгасу рабочай сілай.

С. Б.

Пра ход уборачнай кампаніі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Зямляробства пра ход уборачнай кампаніі, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) ня гледзячы на спрыяючыя ўмовы падвор'я, уборка натуральных сенажацяй, азімых і яравых праходзіць зусім нездавальняюча (выкашана па 1-VIII па сенажацях 57 проц., па азімых — 48 проц., па яравых — 7 проц.), прычым асабліва адстаюць Асьвейскі, Чашніцкі, Брагінскі, Мазырскі, Рэчыцкі, Глускі, Хойніцкі, Горацкі, Дуброўенскі, Ельскі і Лельчыцкі раёны.

б) дрэнпае выкананьне пляну ўборкі зьяўляецца вынікам нездавальняючага апэрацыйнага кіраваньня гэтай справай цэнтральных і раённых устаноў і арганізацый, а таксама таму, што барацьба за якасьць уборкі і са стратамі не пастаўлена ў радзе МТС, саўгасаў і калгасаў як цэнтральная задача.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія саветы, калгасна-зямельныя органы на аснове канкрэтнага і апэрацыйнага кіраваньня кожным сельскім саветам, МТС, саўгасам і калгасам ліквідаваць прарывы ў правядзеньні ўборкі натуральных сенажацяй, азімых і яравых, бо кожны дзень спазьненьня з уборкай дае вялікія страты.

2. Абавязаць зямельна-калгасныя органы, раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія саветы для ліквідацыі прарываў ва ўборцы актывізаваць увесь раённы савецкі актыў, разгарнуць сацыялістычную ўзаемадапамогу адстаючым саўгасам, калгасам і МТС, узмацніць кіраўніцтва ўборачнай у адпасобным сэктары.

Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам шляхам шырокай масавай работы мабілізаваць саўгасы, калгасы і МТС па ўключэньне ва ўсесаюзны рэйд барацьбы са стратамі пры ўборцы і перавозцы, на аснове сацсаперніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі, саўгасамі і МТС, арганізаваўшы прэміяваньне лепшых брыгадзіраў і ўдарнікаў саўгасаў, МТС і калгасаў.

3. Даручыць саўгастрэстам і раённым калгасаюзам скласьці на працягу 2-х дзён для кожнага саўгасу, МТС і калгасу каляндарныя пляны ўборкі натуральных сенажацяй, азімых, яравых і тэхнічных культур і ўстанавіць нагляд і кантроль за ўборкай у вызначаныя тэрміны.

4. Напярэдзіць усе раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы, што толькі бярэжлівыя адносіны і рамонт трактараў і сельска-гаспадарчых машын ёсьць гарантыя поўнага скарыстаньня машына-трактарнага парку рэспублікі.

5. Прапанаваць Белдзяржпаову выдаць пазычкова Сельгасснабу для рамонту трактараў бабіту і волава, а ўпаўнаважанаму камітэту па загатоўках адпусьціць Белкаапрамсаюзу 25 тон пянькі для вырабу пасаў для малатарань.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.
4 жніўня 1932 г., № 412.

Высокі ўраджай—вынік крапатлівай работы

Лейзэр любіць свой калгас, шануе кожную дробязь гаспадаркі. Ад яго вачэй рэдка калі ўхіляе якая-небудзь гаспадарчая непаладка.

А кіш, каб вас!.. Вось «публіка». Не пасьпеў яшчэ ячмень, як іх ужо поўна.

Лейзэр бярэ камень і кідае ў кур. Ня можа ён абыйсьці міма, каб не паказаць палет каў свайго калгасу, 20-гэктарны сад, з задавальненьнем паказвае кожную градку, кожны ядраны саквэтны гурок 15-гэктарнага гароду.

— А тушо ў нас,—гаворыць Лейзэр,—дзьве тысячы рублёў капітуе, калі ня больш... — Падыходзім да нясконпанага гумна, якое дабудоўваюць зараз цесьляры. Лейзэр спыняецца і пачынае апавядаць гісторыю яго ўзьнікненьня.

Зубараў Лейзэр — старшыня інтэрнацыянальнага калгасу «Інтэрнацыянал» (Грозаўскі пацсавет, Капыльскі раён). У калгасе працуе 18 яўрэйскіх сем'яў і 22 беларускія. Гаспадарка існуе трэці год. Летась калгас быў самы адсталы ў раёне. Прычына—засьмечанасьць яго пэнманамі, ліпэнцамі, якія праводзілі сваю клясава-варожую работу. Калгас ня мог пры такім складзе расьці, умацоўваць сваю гаспадарку. Ня было і прыліву.

І толькі ў гэту зіму з калгасу былі вычышчаны шкоднікі.

Трэцюю бальшавіцкую сяўбу калгас сустрэў і пачаў праводзіць пры паяўпасьці 27 сем'яў. Старшынёй яго стаў бядняк, кандыдат КП(б)Б — Зубараў Лейзэр.

Новае праўленьне пачало працаваць паповаму. Максымум сіл было кінута на выкананьне пляну веснавой сяўбы. Разам з гэтым праўленьне шмат увагі аддавала «дробязям» жыцьця кожнага калгасьніка.

У калгас пачала падаваць заявы мостачковая беднота. За час сяўбы было прынята 8 гаспадарак. Вясной калгас зьдзівіў усіх у раёне—з адстаючага стаў адразу перадавым. Плян сяўбы быў выкананы на 143 проц.

Уборку ўраджаю калгас таксама сустрэў новым прыливам. Уступіла 5 гаспадарак.

* * *

Асноўны ўхіл калгасу — садова-гародны. На 15-гэктарным гародзе засеяна: капусты—3,9 гэкт., буракоў — 2,62 гэкт., бруквы сталовай — 0,25 гэкт., гуркоў — 3,9 гэкт., памідораў — 1,1 гэкт., цыбулі — 0,1 гэкт., высадкі—0,5 гэкт. і інш. Заданьне калгасу было 10 гэкт., 15 га — гэта сустрэчная лічба.

У садзе і на гародзе працуе садова-гародная брыгада. Брыгада зараз наладзіла добрую ахову гароду і саду як ноччу, так і днём. Гародніна добра дагледжана. Гэта справа рук лепшых ударніц-гароднік — **Русаковіч Касі, Сталымах Россі, Кудзёлка Мані, Дукорскай Рохлі і Шульман Міркі.** Гародніна некалькі разоў праполвалася, таму дасягнут высокі ўраджай.

Калгас зараз прыступіў да рэалізацыі ўраджаю. Выбіраюцца гуркі і тут-жа на месцы здаюцца засолачнаму пункту Белплодагародніны. У мястэчку Грозаў калгас адкрыў свой ларок для рэалізацыі гародніны і садавіны. У ларку працуе лепшая 50-гадовая гароднліца Шульман Мірка. У далёкім, калі пасьпее садовіна і ўся гародніна, калгас памеціў адкрыць яшчэ 1-2 ларкі. Будынкі ўжо падрыхтаваны.

За прададзеныя гуркі калгас на 1 жніўня атрымаў каля 3.000 руб. Грошы зараз выдаюцца калгаснікам авансам па 50 кап. на працадзень.

У калгасе яшчэ шмат сёньня спадчыны ад мінулага праўленьня. Назіраецца нявыхад на работу. Дрэнна арганізавана ўборка сенажаці. Гэтыя недахопы патрабуюць ад калгасьнікаў іх своячасовай ліквідацыі, каб да часу ўборкі садавіны і гародніны прыйсьці падрыхтаванымі і мець належную колькасьць рабочай сілы. Вялікі ўраджай у садзе і гародзе патрабуе ад праўленьня зараз-жа падрыхтаваць тару і перавозачныя сродкі, каб менш было страты пры рэалізацыі прадукцыі. Аб гэтым праўленьне яшчэ не думала.

М. Вішнеўскі.

Капыль, калгас «Інтэрнацыянал».

Першы чырвоны абоз са збожжам у Менску

У адзнаку поўнага скончэньня ўборкі азімых, 5 жніўня ў Менск **прыбыў першы чырвоны абоз са збожжам новага ўраджаю.** У абозе прымалі ўдзел калгасы: **імя Варашылава, імя БАК і «Ленінскі шлях»,** якія прывезьлі 116 цэнт. жыта, 7 цэнтр. ячменю і два вазы сена.

Каля цэнтральнага складу Белканторы Загатзбожжа адбыўся ліпучы мітынг-сустрэча.

Сакратар Самахвалавіцкай аперацыі парт'ячэйкі тав. **Матусевіч** у кароткай прамове рапартаваў аб посьпехах скончэньня ўборкі азімых па ўсім сельсавеце.

Калгасьнікаў Самахвалавіцкага раёну ў асобе ўдзельнікаў абозу віталі прадстаўнікі гарадскому тав. **Данільчык** і ад райкалгасаюзу тав. **Грушнікаў.**

Адказваючы на прывітаньне, калгасьнік тав. **Стаханчык** заявіў гарадзкі камітэт КП(б)Б, што сьледам за ўборкай перадавікі Самахвалавіцкага сельсавету таксама па-ўдарнаму правядуць загатоўчую кампанію. «Ні аднаго снапа не пакінем на полі, ні аднаго кілёграма збожжа прыватніку».

— Кожны калгасьнік,—заявіў тав. Стаханчык—лічыць справай гонару па-баявому змагацца за выкананьне пастаўленых нашай бальшавіцкай партыяй задач.

Самахвалавіцкі абоз—паказальнік высокай сьвядомасьці калгасьнікаў у выкананьні сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

Гэта сьвядомасьць—моцная зарука таго, што сьледам за перадавікамі калгасьнікі і аднаасобнікі беднякі і сераднякі ўсіх сельсаветаў Менскага раёну, як і ўсёй БССР, патокамі чырвоных абозаў будуць дэманстраваць сваю адданасьць партыі, сваю рашучасьць да выкананьня баявых гаспадарча-палітычных задач.

Арганізавана сустрэць новы збожжавы паток—важнейшая частка загатоўчай работы. Гэта ў даным выпадку трэба падкрэсьліць таму, што работнікі менскай міжраённай базы непадрыхтавана сустрэлі нават першы абоз.

Мітынг—сустрэча чырвонага абозу.

10 ЖНІЎНЯ—ЮБІЛЕЙ „ЗЬВЯЗДЫ“

Вопыт армавірскіх калгасьнікаў—на палі Савецкай Беларусі!

АРГАНІЗУЙЦЕ „СКИОС“ ІМЯ 15-ГОДЗЬДЗЯ „ЗЬВЯЗДЫ“

Справай гонару кожнай раённай газэты, кожнага журналіста і рабселькора павінен стаць удзел у арганізацыі „Скиос“ у сваім раёне

Перадаю брацкае прывітаньне цэнтральнаму органу КП(б)Б — газэце **«Зьвязда»** ад імя магутнага атраду бальшавіцкага друку Армавірскага раёну, ад шматлікай арміі рабселькораў і раённай газэты **«Армавірская камуна».**

Перадаючы прывітаньне, мы прапануем адзначыць юбілей «Зьвязды» шырокай арганізацыяй ва ўсіх перадавых раёнах **«скиос» імя 15-годзьдзя «Зьвязды».**

Што такое **«скиос»?**

Ён нарадзіўся на палёх Армавірскага раёну сацыяльнай калектывізацыі. «Скиос» быў заклікан да жыцьця сіламі ўдарнікаў-калгасьнікаў, ударнікаў друку. «Скиос» павінен і можа быць усюды, дзе б'ецца калгасная вынаходніцкая мысьль, дзе ёсьць бальшавіцкі друк.

Слова «скиос» зараз разумеюць многія калгасьнікі армавірскіх станіц, скіесьнікаў ведаюць у раёне. Кубані, але іх павінны ведаць і калгасьнікі ўсёй нашай краіны.

Але што-ж такое «скиос»?

Расшыфруем.

«Скиос» азначае — самадзейная калгасная вынаходніцка-вопытная станцыя.

У раёне Армавіра арганізацыя «скиоса» ў гэтым годзе зьяўляецца вынікам калгаснага разьліку ў мінулым годзе. Гэты разьлік быў арганізаваны друкам раёну і ўключаў такую суму рацыяналізатарскіх прапаноў, унесеных калгасьнікамі, у выніку чаго меркавалася атрымаць 2 мільёны эканоміі працадзён ад паляпшэньня ў рабоце машын на калгасных палёх.

Але прапановы сабраны. Што-ж рабіць далей? Дзе цэнтр, які распрацоўвае гэтыя прапановы, правярае іх на практыцы і ўкараняе ў калгасную вытворчасьць?

Адсюль нарадзіўся «скиос».

Ён арганізуецца пры адным з лепшых і буйных калгасаў раёну, недалёка ад раённага цэнтру. Майстэрня калгасу — лябараторыя «скиос», пэўная частка зямлі калгасу—вопытнае поле «скиос».

У Армавіры «скиос» існуе пры **перадавым калгасе імя Леніна ў Армюрце і абслугоўвае, зразумела, увесь раён.**

Што нам даў «скиос» у гэтым годзе?

«Скиос» зараз распрацоўвае 6 прапаноў. **З іх адна закончана і дае нам у гэтым годзе 100.000 працадзён эканоміі на ўборцы сланэчніка. Паўтараем — адна прапанова і сто тысяч працадзён эканоміі.**

Прапанова заключаецца ў тым, каб прыстасаваць снопавязалку да мэханізаванай уборкі сланэчніка. Прыстасаваньне можа зрабіць калгасны каваль у абстаноўцы звычайнай калгаснай кузьні на працягу аднаго-двух дзён. У тай-жа абстаноўцы сваімі сіламі гэта снопавязалка зноў можа быць прыстасавана для ўборкі збожжавых.

У гэтым і прырода «скиос». Ён распрацоўвае тое, што прыймальна ў яго раёне ў звычайнай калгаснай абстаноўцы. Больш складаныя справы перадаюцца ў заводзкія лябараторыі. Так, завод **«Серп і молат»** зараз распрацоўвае прапанову аб канструкцыі і прыстасаваньні сланэчнай малатарні — адной з прапаноў нашага разьліку.

«Скиос» у нас у Армавіры мае савет, выбраны на зьлёце брыгадзіраў раёну. У савет уваходзяць калгасьнікі-рацыяналізатары, аграномы і прадстаўнікі друку. На чале «скиос» знаходзіцца калгасьнік-ударнік вытворчасьці і друку, актыўны селькор «Армавірскай камуны» два разы прэміяваны, рэдактар насьценнай газэты, зараз дырэктар «скиос» тав. **Каспараў.**

Скончыўшы распрацоўку прапаноў, «скиос» зьбірае паляводаў і брыгадзіраў, паказвае ім на практыцы, як трэба праводзіць даную рацыяналізатарскую прапанову, паказвае на вопытным полі як працуе машына да ўдасканаленьня і пасьля. Такім чынам, кожны ведае, што і як яму рабіць у сябе ў калгасе.

«Скиос» ёсьць самадзейная ўстанова. Агульнае кіраўніцтва ажыцьцяўляе райкалгаскаюз.

«Скиос» у Армавіры ёсьць дзецішча калгаснай самадзейнасьці мас і ўзор арганізатарскай ролі бальшавіцкага друку і яе арміі рабселькораў.

«Скиос» ёсьць масавы рух калгасьнікаў, так да яго трэба падыйсьці раённым газэтам.

Адзначым пятнаццацігодзьдзе «Зьвязды» стварэньнем «скиос» у раёнах БССР, стварэньнем «скиос» імя «Зьвязды».

Дэлегат міжкраявой нарады па конкурсе «Правды», рэдактар газэты «Армавірская камуна»

І. ВЫШЭГРАД.

Працаваць так, як вучыць КП(б)Б

Мы, удзельнікі міжраённай куставой партыйнай нарады 14-ці раёнаў, што сабраліся для распрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў па перабудове партыйнай работы, шляхам перанясеньня яе ў нізавыя саўгасныя і калгасныя зьвяны, шлем ЦО КП(б)Б «Зьвязьдзе» ў дзень гістарычнага яе юбілею гарачае бальшавіцкае прывітаньне.

«Зьвязда», якая ўзначальвае бальшавіцкі друк БССР, заўсёды вучыла і вучыць як трэба па-бальшавіцку перабудоўваць нашу работу, каб лепш забясьпечыць партыйным кіраўніцтвам усе зьвены сацыялістычнага будаўніцтва. «Зьвязда» сыстэматычна на сваіх старонках вызначае ролю камуністаў, камсамольцаў на вытворчасьці, калгасах, саўгасах і МТС. Роля «Зьвязды» ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі надзвычай вялікая. Праводзячы бязьлітасную барацьбу з клясавымі ворагамі ў горадзе і на вёсцы, «Зьвязда» паказвае лепшы прыклад арганізацыі і мабілізацыі калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў на выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

У адзнаку 15-цігадовага юбілею «Зьвязды» і 5-цігодзьдзя пераходу яе на беларускую мову мы, удзельнікі партнарады, уключаемся ў рэйд ударнікаў друку імя 15-цігодзьдзя і бярэм на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы. Абавязваемся адразу-ж па сьпя прыбыцьця на месца разгарнуць работу па давядзеньні да калгасаў, брыгад, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

На аснове разгортваньня партыйна-масавай работы ў калгасах, брыгадах і вучастках, абавязваемся скончыць уборку ўраджаю ў самы кароткі тэрмін, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу са стратамі. Правільна расставіць партыйныя і камсамольскія сілы ў брыгадах і вучастках, забясьпечыўшы іх пастаянным партыйным кіраўніцтвам, праз стварэньне ў кожнай брыгадзе партгруп і вылучэньне партарганізатараў.

Строга сачыць за поўным і правільным скарыстаньнем уборачных машын і цягавай сілы, праводзячы рашучую барацьбу з абязьлічкай.

Усю сваю ўвагу зьвернем на правільную расстаноўку сіл у брыгадах, узмацненьне прадсыцьпліны, дакладны і сваячасовы запіс працадзён у кніжкі калгасьнікаў, разгортваючы сацспаборніцтва паміж брыгадамі і калгасьнікамі.

Як канкрэтнае мерапрыемства па барацьбе са стратамі, абавязваемся па-бальшавіцку змагацца, каб не пакінуць ніводнага коласу ў полі ў часе ўборкі, не пакінуць ніводнага гаўнаўборачнай бульбы.

Надаючы вялікае значаньне сваячасовай уборцы ільну, як сырцовай базы прамысловасьці, якая выпрацоўвае прадукцыю шырокага спажываньня, абавязваемся настойліва змагацца за тое, каб ні ў якім разе не дапускаць перастоі ільну, пачаць церабіць яго ў раньняй, жоўтай сьпеласьці, ужываючы канвэерны спосаб яго апрацоўкі. Таксама давесьці да кожнай брыгады і калгасьніка агратэхнічныя мерапрыемствы па барацьбе са стратамі ў часе ўборкі і апрацоўкі ільну.

Зараз-жа разгорнем масавую работу па авансаваньні і разьмеркаваньні ўраджаю, прытрымліваючыся прынцыпу разьмеркаваньня па колькасьці і якасьці апрацаваных працадзён.

На аснове лепшага давядзеньня да кожнага калгасьніка і аднаасобніка — бедняка і серадняка пастаноў ЦК і СНК аб збожжа і масазагатоўках, с.-г. падатку і калгасным гандлі, правесьці шырокую масава-растлумачальную работу вакол поўнага і сваячасовага выкананьня загатоўчых пляцаў, с.-г. падатку, арганізаванага выезду калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў на савецкія базары.

Па распаўсюджаньні «Зьвязды» мы абавязваемся ахапіць падпіскай на «Зьвязду» ўсіх партыйцаў, камсамольцаў, сельсавецкі, калгасны і саўгасны актыў.

З мэтай паляпшэньня марксыцка-ленінскага выхаваньня працоўных, партыйцаў, камсамольцаў мы абавязваемся разгарнуць работу па наладжаньні партыйнай работы.

Запэўняем «Зьвязду», што за выкананьне гэтых абавязкаў будзем змагацца так, як вучыць нас ЦК КП(б)Б і яе цэнтральны орган «Зьвязда».

Зварачаемся да ўсіх сельсавецкіх, саўгасных, калгасных і парт'ячэек МТС, да ўсіх партгруп і партарганізатараў адзначыць гістарычны юбілей «Зьвязды» **ўзяцьцем на сябе канкрэтных абавязкаў па хутчэйшым і лепшым завяршэньні ўборачнай і падрыхтоўцы да асеньняй пасеўнай.** Мы заклікаем вас да лепшага давядзеньня пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б да шырокіх працоўных мас, да сапраўднай перабудовы партыйнай работы, да ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва ўсімі зьвеньнямі нашай вялікай сацыялістычнай будоўлі, працаваць так, як вучыць нас КП(б)Б у асобе ЦК і «Зьвязды».

Па даручэньні куставой нарады — БОЙКА, КАВАЛЁЎ, ВЕРАБ'ЁЎ, КУЧЫНСКІ, МІКЛУШЮЎ, БОЛЬШАК, СІРОЦІНА, САЛАМОНАЎ, КІСЬЦЮЧЭНКА, УШАКОЎ, БУЕВІЧ, ГШЭНДЗЕЛЁЎ, ДЗЕМ'ЯЧОНАК.

Гор. Віцебск.

„БЕРАЖЭЦЕ КОЖНЫ КОЛАС, КОЖНАЕ ЗЕРНЕ“

ЛІСТ КАМУНЫ „ПРАГРЭС“, ЛЁЗЬНЯНСКАГА РАЁНУ

Таварышы!

Набліжаецца пятнаццацігодзьдзе ЦО КП(б)Б — газэты «Зьвязда», нястомнага змагара за генэральную лінію партыі.

Сьвята «Зьвязды» — сьвята ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Камуна «Прагрэс» сёньня падагульвае вынікі сваёй работы і дасягненьняў. Яны сталі магчымы толькі пад правільным кіраўніцтва ЦК КП(б)Б і пры дапамозе яго ЦО —газэты «Зьвязда».

Газэта «Зьвязда» нас бадзёрыла і давала ўпэўненасьць, калі друкавала на сваіх старонках дадатны матар'ял і паказвала наш вопыт як узорны; «Зьвязда» вучыла нас як трэба працаваць, калі выкрывала нашы памылкі і паказвала, як іх ліквідаваць.

Пры дапамозе «Зьвязды» мы дабіліся наступнага.

У былым маёнтку «Кавалі» пана Канькова, сядзеўшага тут на волі Прышчэпава да 1929 году, вырасла камуна «Прагрэс». У камуну ўступілі былыя панскія батракі, вакалічная беднота і серадняцтва. Зараз у камуне 92 гаспадаркі.

Ня будзем падаваць лічбаў. Скажам адно: мы кожны год атрымліваем прэміі за ўзорную работу. У мінулым годзе за ўзорнае правядзеньне ўборкі ільну, за датэрміновае скончэньне пераапрацоўкі, за перавыкананьне пляну ільназагатовак, за здачу дзяржаве высакаякаснага валакна і семя мы атрымалі першую ўсесаюзную і першую ўсебеларускую прэмію.

Гэты вялікі гонар вымагае ад нас і вялікіх абавязацельстваў. З усёй адказнасьцю мы разумеем задачы ўборачнай кампаніі і важнасьць сваячасовага выкананьня пляну загатовак у гэтым годзе — завяршаючым годзе першай пяцігодкі. Мы і сёлета з посьпехам змагаемся за ажыцьцяўленьне задач, ускладзеных на нас партыяй.

Сваім вопытам барацьбы за новы ўраджай мы і хочам падзяліцца на старонках нашага арганізатара, прапагандыста і агітатара — газэты «Зьвязда».

Цэнтральнай задачай уборачнай кампаніі гэтага году партыя паставіла барацьбу са стратамі. Мы па-ўдарнаму правялі ўборку сенажаці, рыхтуем другі ўкос. **76 гэкт. жыта ўбрана за 5 дзён, замест 10, вызначаных плянам.** Жніво скончана 1-га жніўня. Зараз ідзе масавая звозка снапоў з поля. Камуністы і камсамольцы арганізавалі пачную звозку снапоў. Учачы не асьпяецца зерне. **Не дапускаем страт. Мы навучыліся берагчы кожны колас, кожнае зерне. Ураджай жыта ў нас каля 10 цэнт. з га ў сярэднім, замест 4-х цэнт. летась. Гэта — вынік барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці.**

Як мы дабіліся гэтых посьпехаў?

Правільнай арганізацыяй працы, сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, поўным ажыцьцяўленьнем 6 умоў тав. Сталіна.

Усе сілы камуны разьбіты на тры брыгады, якія прымацаваны да вытворчых вучасткоў. Вытворчыя заданьні брыгадам даны на круглы год. Ліквідавана абязьлічка, ураўнілаўка. Няма самацёку і перакідак людзей. Кожны ведае сваю работу.

На час уборкі, у залежнасьці ад характару работы, складаюцца вытворчыя групы. Напрыклад: касцоў, жнец, падграбальшчыкаў і г. д. Групы разьбіваюцца на зьвяны. Работа кожнага камунара і камунаркі ўлічваецца асобна.

Гэта спрыяе разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва, выкананьню і перавыкананьню норм. Вось прыклады:

На касьбе сыстэматычна перавыконвала нормы група **Дзегцярова Хведара** (брыгада № 1). Гэта група замест 0,33 гэкт. скошвала па 0,5 гэкт. па чалавека ў дзень. У брыгадах № 2 і № 3 шырока скарыстоўвалася жаночая сіла на касьбе. Жанчыны не адставалі ад мужчын.

Касцы брыгады № 2 т. т. **Дабракоў Кірыла, Барчанка Апанас, Лебедзеў Алесь** сыстэматычна перакопвалі па 0,6 гэкт. у дзень. Нават стары камунар Лішакоў Рыгор, 65 год, пакошваў па 5,40 гэкт., а часамі і больш.

Уборка жыта ў скарочаныя тэрміны таксама была магчыма **толькі** на аснове шырокага ўжываньня сацыялістычных мэтадаў працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва, перавыкананьня норм. Была ўстаноўлена групавая зьдзельшчына з індывідуальным улікам працы. Норма — 3,5 капы на жніво. Асобнымі ўдарнікамі нормы перавыконваліся амаль у два разы.

Брыгада МТФ пасьля догляду і дойкі кароў, таксама выходзіла на жніво і асобныя даркі нажынялі да 4 коп у дзень, напрыклад, **Хахлова** Варвара, **Салядкова** Марыя, **Рыбакова** Хадора.

Так ударнымі тэмпамі правялі ўборку сена і жыта.

1 жніўня пачалося перабліваньне ільну ў стадыі раньняй жоўтай сьпеласьці. Трэба ўбраць і апрацаваць 143 гэктары. На ўборку ільну пастаўлена 80 чалавек. Выпрацаваны нормы, даведзены да кожнага камунара і камунаркі. Нормы паступныя: 3,5 капы снопаў на адну церабільшчыцу, г. зн. 8-9 чалавек на гэктар. Нормы высокія. Але — першы дзень работы паказаў, што і яны перавыконваюцца.

Лепшыя ўдарніцы на ўсіх работах — **Шухрова Варвара, Шэндзелева Еўдакія, Казакова, Марфа** і некаторыя іншыя нацерабілі па 4 капы. Абяцаюць дабіцца яшчэ больш высокіх норм.

Гатоўнасьць кожнага камунара і камунаркі да нястомнай барацьбы за ўраджай дазваляе нам узяць на сябе наступныя абавязацельствы:

Уборку ільну скончыць да 15 жніўня, замест 30 жніўня, паводле раённага пляну;

Абмалот галовак і расьціл ільну **скончыць да 5 верасьня;**

Да 1 кастрычніка скончыць падняцьце трасты са сьцеліўч;

Не пазьней 1 сьнежня скончыць апрацоўку трасты, здачу трасты на ільназавод і здачу дзяржаве ільнавалакна і семя высокай якасьці і апрацоўкі.

Мы паставілі сваёй задачай дабіцца ў гэтым годзе на менш **3,5 цэнт валакна з гэктару.** Упэўнены, што гэтага даб'емся, сваячасова правёўшы ўборку і апрацоўку ільну, не дапускаючы страт.

Праца для камунараў і камунарак стала справай гонару, славы і герайства.

Мы заклікаем усіх рабочых і работніц саўгасаў, калгасьнікаў і калгасьніц, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў усёй БССР пасьледаваць нашаму прыкладу — па-бальшавіцку правесьці ўборку ўраджаю, апрацоўку і здачу прадукцыі дзяржаве.

Узмацненьнем тэмпаў работы, узмацненьнем барацьбы за колькасныя і якасныя паказальнікі працы адзначым юбілей пятнаццацігодзьдзя ЦО КП(б)Б — «Зьвязды».

Па даручэньні агульнага сходу камуны «Прагрэс» — члены праўленьня, брыгадзіры, ударніні і ўдарніцы.



Шпала-рэзальны завод прысвойвае імя „Зьвязды“

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). Адбылося ўрачыстае адкрыцьцё шпалярэзальнага заводу, які мае гадавую праграму ў 3 млн. руб. У адзнаку 15-гадовага юбілею газэты «Зьвязда» прынята рашэньне аб наданьні заводу імя «Зьвязды».

Самая лепшая брыгада тав. **Іванова-Маркела** абвясьціла сябе ўдарнай імя 15-годзьдзя «Зьвязды» і патрабавала ад дырэкцыі пераводу на гаспадарчы разрахунак.

А. ГЕЛЬФАНД.

Уключаюцца ў рэйд 15-годзьдзя „Зьвязды“

СЛУЦАК. (Белта). У сувязі з надыходзячым пятнаццацігадовым юбілеем газэты «Зьвязда» і пяцігодзьдзем пераводу яе на беларускую мову па гораду і раёну з 1 па 10 жніўня праводзіцца **масавы рэйд ударных брыгад друку імя 15-годзьдзя «Зьвязды».**

Мабілізовая актыў гораду, пасланы брыгады для дапамогі ў правядзеньні рэйду ў калгасах і саўгасах раёну.

Асноўнай задачай рэйду зьяўляецца: праверка рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна на прадпрыемствах, калгасах і саўгасах; разгортваньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня; рэалізацыя дырэктывы партыі аб калгасным гандлі і арганізацыі сустрэчнага патоку прамтавараў; мабілізацыя мас на хутчэйшае і добраякаснае скончэньне ўборачнай кампаніі, арганізацыя чырвоных абозаў новага ўраджаю.

* * *

РЭЧЫЦА. (Белта). Райком партыі і рэдакцыя раённай газэты «Рэчыцкая праўда» ўключыліся ў падрыхтоўку **да юбілею 15-годзьдзя «Зьвязды».**

Раённы актыў накіраван у сельсаветы і на прадпрыемствы для дапамогі ў правядзеньні рэйдаў ударных брыгад друку, па пытаньні разгортваньня вырабу рэчаў шырокага спажываньня і арганізацыі калгаснага гандлю.

На мясцох разгорнута масавая работа—даклады, гутаркі і выпуск насьценгазэт, прысьвечаных юбілею і правядзеньню рэйдаў.

Грыневіч

Захват мытняў і пошты ў Манчжурыі

Мінула каля двух месяцаў з таго часу, як імпэрыялістычная проса сьвяткавала надпісаньне Шанхайскай згоды. Буржуазныя пісакі імкнуліся запэўніць народныя масы, што на Далёкім Усходзе няма больш вайны і яма больш пагрозы новай сусьветнай бойні,—ак старонкі тых-жа газэт зноў поўны трывожнымі паведамленьнямі з Кітаю. На гэты раз новадам да трывогі зьявіўся **захват марыянэтачным урадам «Манчжоуго» спачатку кітайскіх мытняў, а потым пошт у Манчжурыі, і новае наступленьне японскіх войск на Жэхэ.** Чаму пытаньне аб мытнях выклікала такую трывогу з боку дзяржаў? Які сэнс барацьбы, якая разгортваецца каля пытаньня аб манчжурскіх мытнях?

Шанхайская згода 3 мая г. г., будучы здрадніцкай капітуляцыяй гаміндана ўраду, была разам з тым і змовай імпэрыялістычных дзяржаў у Кітаі. Шанхайскі часовы кампраміс паміж дзяржавамі быў магчымы таму, што ў даны момант і для Англіі і для ПАЗШ разьвіцьцё крызісу зрабіла асабліва важным вырашэньнем эўрапейскіх пытаньняў, г. з. перш за ўсё пытаньня аб банкруцтве раздушанай Вэрсалем і сусьветным крызісам Германіі, дзе замарожаны вялізарныя ўкладаньні Амэрыкі і Англіі, і зьвязанага з гэтым пытаньня аб міжсаюзных даўгох дзяржаў.

Пасьля таго, як Японія сустрэлася з гераічным супраціўленьнем рабочых, працоўных і салдат у Шанхаі, а ў Манчжурыі стала перад паймацнейшым супраціўленьнем народных мас, пасьля таго як няўдачы ў Кітаі і антыяпонскі байкот надзвычай абвастрылі ўсе праяўленьні крызісу ўнутры самой Японіі,—яна стала перад необходнасьцю ўвязіць фронт свайго наступленьня на Кітай. ПАЗШ пасьля няўдачных спроб наладзіць сумесьнае з Англіяй выступленьне супроць Японіі і не адважваючыся на самастойнае выступленьне, таксама пашыны былі шукаць такога вырашэньня, якое, не замацоўваючы за Японіяй яе захватаў, дазволіла-б адвяліць барацьбу з ёй у больш спрыяючых для ПАЗШ умовах. З гэтай абстаноўкі найбольшыя выгоды атрымала Англія. Яна ўзяла ў свае рукі ініцыятыву перагавораў у Шанхаі і спыніла японскае наступленьне ў даліне Яцзы, якую яна лічыць сваёй сфэрай уплыву, вельмі ўзмацніла свае пазыцыі ў Кітаі, галоўным чынам за кошт уплыву Амэрыкі.

Зусім не адмаўляючыся паогул ад сваіх плянаў у даліне Яцзы, Японія перакінула свае войскі адсюль на дапамогу сваім сілам у Манчжурыі. Там становішча складалася для яе нявыгодна. Спробы стварыць у аблічы «Манчжоуго» апарат, які дапамог-бы Японіі падпарадкаваць краіну, далі мізэрныя выпікі. Уздым антыяпонскага масавага руху ў Манчжурыі прывёў да таго, што акупанты аказваюцца ізаляванымі і знаходзяць адданых лёкаеў амаль толькі сярод рускай белагвардзейшчыны.

Японская ваеншчына абяцала, што акупацыя Манчжурыі прынясе вызваленьне ад крызісу, што Манчжурыя стане «земным раем для ўсяго японскага народу». На справе аказалася, што народныя масы павінны аплачваць новыя і новыя асыгнаваньні на вайну ў Манчжурыі. Мільярдныя ўкладаньні японскіх капіталістаў і ўраду ў чыгункі і розныя прадпрыемствы Манчжурыі трапіць каштоўнасьць з прычыны хаваліку эканамічнага жыцьця краіны. У той-жа час у эканамічным становішчы ў самой Японіі наступае далейшае рэзкае пагоршаньне. Падае японская валюта; адбываецца новае рэзкае паніжэньне цэн на тоўк. Масы напаўпрыгонгнага сялянства, задушаныя кабальнымі даўгамі, ужо галадаюць у радзе вобласьцяй. Прамысловасьць задыхаецца з прычыны адсутнасьці рынкаў збыту; расьце беспрацоўе.

«Умовы, якія наглядаюцца, нясуць за сабой востры піхаманкавы настрой у вёсцы, які паступова ахапляе ўсю нацыю. Гэта пытаньне існаваньня і калі ваенныя ўдарылі нечакана ў Манчжурыі, гэта адбылося таму, што «кабінет» генэральнага штабу добра ведаў аб няшчасьцях у сельскіх раёнах і палічыў за лепшае прадпрыняць якую-небудзь дывэрсыю, чыны чакаць нежмінучага, бо яны пачнуць і зараз лічаць, што павінна наступіць аграрная рэвалюцыя, калі толькі ўмовы не палепшацца».

Гэта пішна токійскі карэспандэнт кансарватыўнай ангельскай газэты («Норд Чайна Геральд» ад 14 чэрвеня) і да гэтага трэба дадаць рост забастовачнага руху японскага пралетарыяту і рэвалюцыянізаваньне студэнцтва і моцны рост уплыву японскай камуністычнай партыі. Меры, што прымаюцца японскай ваеншчынай, адлюстроўваюць тое пагыбленьне крызісу ў краіне, якое адбылося ў верасьні мінулага году.

Захват манчжурскіх мытняў наогул даўно стаіў на парадку дня японскай ваеншчыны. Пасьля захвату Манчжурыі японцы сыстэматычна атрымоўваюць у сваіх руках усю важнейшую зброю панаваньня ў краіне—чыгункі, банкі, параходзтва, паколькі яны не знаходзіліся ў японскіх руках раней. Амаль зараз-жа пасьля агалашэньня Манчжурскай дзяржавы былі назначаны японскія дарадцы ва ўсе мытні ў Манчжурыі. Каля 20 чэрвеня Манчжурскі ўрад патрабаваў перадачы яму даходаў з Дайрэнскай мытні і даў распараджэньне казначэйству гэтай мытні, японцу Фукумота і банкам спыніць перадачу даходаў у Шанхай. Гэтым Японія, якая стаіць за Манчжурскім урадам, падрыхтоўвала аб'яднаньне Манчжурскіх мытняў у сваіх руках.

Захват мытняў зьяўляецца часткаю японскага пляну поўнага ператварэньня Манчжурыі ў сваю правінцыю. Па працягу апошніх 2-3 месяцаў у цэнтры ўвагі японскай прэсы стаяць іменна пытаньні аб прызнаньні Манчжурскага ўраду, аб рэарганізацыі сыстэмы японскіх ваенных і грамадзянскай улады ў Манчжурыі пад уладаю намесьніка генэрал-губернатара. За ўсім гэтым стаіць адно і тое-ж—**канчатковае і поўнае замацаваньне Японіяй захвату Манчжурыі,** і гэта пытаньне японская ваеншчына высоўвае з тым большай нэрвовасьцю, чым больш вострым становішча ўнутранае становішча і чым больш баіцца япона пашыпальна-рэвалюцыйнага руху народных мас Кітаю і супраціўленьня сваіх імпэрыялістскіх суперникаў.

Захват манчжурскіх мытняў, а пазьней і пошт, прывёў да абвастрэньня яе адносін з іншымі дзяржавамі і перш за ўсё з Англіяй, хаця іменна ў яе твары Японія знаходзіла да гэтага часу сур'ёзнае падтрыманьне.

Кітайскія морскія мытні з сярэдзіны мінулага стагодзьдзя знаходзяцца ў руках чужаземцаў і толькі фармальна падпарадкоўваюцца кітайскаму ўраду. На чале мытняў заўсёды стаяў ангелец (зараз гэта сэр Мазэ), ангельцы складаюць таксама і большасьць вышэйшых служачых мытняў. Мытныя даходы захоўваюцца ў ангельскім (Ганконг—Шанхайскім) банку. Гэтыя даходы служаць забесьпячэньнем як чужаземных, так і ўнутраных кітайскіх пазык, процанты і пагашэньні па якіх праводзяцца такім чынам фактычна ангельцамі. З прычыны таго, што рэшткі мытных даходаў складаюць важнейшую крыніцу фінансаваньня кітайскага ўраду (пад заклад іх ён звычайна выпускае ўнутраныя пазыкі), дык маючы ў сваіх руках кіраўніцтва мытнямі, ангельцы праз гэта атрымліваюць надзвычайны ўплыў і на кітайскі ўрад і на масу кітайскіх трымальнікаў пазык—кітайскіх банкіраў, буржуазію і памешчыкаў. Разам з тым кіраўніцтва мытнямі палячае Англіі панаваньне над эканомікай Кітаю.

Кіраўніцтва мытнямі ангельцы разглядаюць як адну з важнейшых сваіх пераваг, якая палячае ім барацьбу за панаваньне ў Кітаі, за найбольшую долю ў падзеле Кітаю. Таму ангельцы пратэстуюць супроць захвату манчжурскіх мытняў ня толькі таму, што за гэтым нямінуча рана ці позна пасьледуе закрыцьцё Манчжурскага рынку для ўсіх дзяржаў, апрача Японіі, але і таму, што захват гэтых мытняў (на іх долю прыпадае прыкладна 1/6 агульнага мытнага даходу ў Кітаі) **нанесьць моцны ўдар па пазыцыях Англіі.** І гэта робіцца ў такі момант, калі яна, з прычыны свайго узрослага ўплыву на Паўночы, разьлічвае вырокам скарыстаць гэтыя свае пераваги. **Да таго-ж Англія не без падставы непакоіцца, каб Японія не пашырыла гэты Манчжурскі вопыт і на Паўночны Кітай.**

Што датычыць ПАЗШ, дык яны выступаюць супроць гэтага захвату і з прычыны сваёй агульнай варожасьці супроць Японіі, і таму, што гэта стварае пагрозу канчатковай страты значнага Манчжурскага рынку. Абедзьве дзяржавы (да іх далучыліся Францыя і Італія) заявілі пратэст Японскаму ўраду. Адказ Японіі зводзіўся да таго, што гэта справа рук Манчжурскай улады. Гэты адказ, зразумела, ня мог задаволіць дзяржаў і звычайна стрыманы ў адносінах да Японіі «Норд Чайна Геральд» пісаў —

«Дзяржавы будуць мець рацыю, калі ўкажуць Японіі, што маскарад «Манчжоуго» можа быць цярпімы, як мясцовая ўжымка, але ён ня можа быць прадстаўлен у якасьці адказу на важкія аргументы супроць сур'ёзнага парушэньня міжнароднай адказнасьці».

Спроба спасылацца на Манчжурскі ўрад выглядае тым больш недарэчна, што Дайрэнская мытня фактычна знаходзіцца на тэрыторыі Японскай Квантунскай вобласьці.

Не дабіўшыся падпарадкаваньня сабе Фукумота, галоўны інспэктар мытняў ангелец Мазэ зьняў яго. За гэтым пасьледаваў уход японскіх служачых мытні, якія праводзяць мытныя апэрацыі ўжо ў якасьці агентаў «Манжкоуго». Былі захвачаны мытні ва ўсіх іншых пунктах Манчжурыі, прычым гэта сучраваджалася гвалтамі над служачымі.

Зьніцьце Фукумота выклікала пратэст з боку японскага ўраду, які адмаўляе права зьмяшчаць галоўнаму інспэктару загадчыка Дайрэнскай мытні без згаднення з японскім пасольствам. З свайго боку Мазэ не згадзіўся з японскім тлумачэньнем гэтага дагавору. Спробы вырашыць пытаньне аб Дайрэнскай мытні шляхам кампрамісу пакуль, скончыліся бэзрэзультатна.

Пытаньне аб манчжурскіх мытнях будзе нарэшце вырашацца ў сувязі з агульным пытаньнем аб Манчжурыі. Перагаворы па гэтым пытаньні набліжаюцца, па сутнасьці яны ўжо адбываюцца.

Камісія Літона ўвязла з сабою ў Токіё ня толькі свае прапановы, але і прапановы Нанкінскага ўраду. Падобна таму, як і Шанхаі ангельскі пасланьнік Ломпсон выступіў пасярэднікам гаміндану, які прадаў працоўныя масы, што змагаліся супроць імпэрыялізму,—цяпер у той-жа ролі пасярэдніка выступае лёрд Літон. **Яго задачай зьдзяйсьніць пераносьці такое рашэньне, якое цэлай фэрмальнага прызнаньня кітайскага суверэнітэту над Манчжурыяй і пры ўмове забесьпячэньня ангельскіх інтарэсаў, зьвязаных з Манчжурыяй, замацавалі-б за японцамі іх панаваньне ў гэтай вобласьці.** Як і ў Шанхайскіх перагаворах буйнейшую ролю будзе адыгрываць імкненьне імпэрыялістаў **нацкаваць Японію на СССР.**

Што гаміндан зусім гатоў да новага здрадніцтва відаць хаця-б з таго, што Чан Кай-шы ў адказ на прапанову выдаць загад аб арышце Пу-і, галавы кукальнага ўраду Манчжурыі, заявіў, што паколькі будзе прызнана старшынства кітайскага ўраду, няма патрэбы ўпарціцца на пытаньні аб асобах.

Ці зможа, аднак, японская ваеншчына, якая падштурхоўваецца канвульсыйным разгортваньнем крызісу, утрымацца ў рамках кампрамісу з дзяржавамі? Наступленьне японскіх войск на Жэхэ, якое ўжо пачалося, дае адмоўны адказ на гэтае пытаньне.

Барацьба, якая разгарнулася вакол манчжурскіх мытняў, лішні раз паказвае, што Манчжурскае пытаньне цесна зьвязана з пытаньнямі ўсяго Кітаю і зьяўляецца клубком вострайшых і нявырашаных імпэрыялісцкіх супярэчнасьцяй. Яна наглядна паказала таксама, наколькі хісткія спробы кампрамісаў і згод паміж імпэрыялісцкімі дзяржавамі, з якой лёгкасьцю ўсурываюцца гэтыя кампрамісы пістрыманым ростам імпэрыялісцкіх супярэчнасьцяй, паглыбленых разьвіцьцём сусьветнага крызісу.

Але разьвіцьцё крызісу актывізуе ня толькі лягер імпэрыялізму. Рабочыя і працоўныя па ўсім сьвеце, у тым ліку і Кітая, шукаюць і знаходзяць рэвалюцыйны выхад з крызісу. Рабочыя і сяляне Кітаю знаходзяць яго ў стварэньні саветаў і Чырвонай арміі, у анты-імпэрыялістыцкай і антыфэадальнай рэвалюцыі.

Аб выніках сталінскага паходу і аб заводзкіх харчовых канфэрэнцыях

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК канстатуе, што сталінскі паход па раду прадпрыемстваў праходзіў, як масавая кампанія, мабілізуючы на барацьбу за паляпшэньне рабочага снабжэньня шырокі актыў рабочых (напрыклад, на Бабруйскім камбінаце прымала актыўны ўдзел у паходзе 300 рабочых, на «Кастрычніку» — 100, «Бальшавіку» — 92 і г. д.).

Рад прадпрыемстваў «Кастрычнік», імя Молатава, «Пралетары», «Бальшавік» і г. д.) правялі значную работу на стварэньні трусатнікаў, пашырэньні сьвінарнікаў і г. д. Напрыклад, на Бабруйскім камбінаце ў часе сталінскага паходу быў створан трусатнік на 100 шт., «Бальшавіку» — 150 шт., абутковай фабрыцы — 70, стада сьвіней на «Чырвонай Бярэзіне» ўзрасло з 80 да 190, заводзе імя Молатава — з 24 да 60, «Бальшавіку»—з 47 да 121 і г. д.

Адначасова ЦК КП(б)Б канстатуе, па-першае, што заводзкія арганізацыі многіх прадпрыемстваў (завод імя Варашылава, «Сьцяг індустрыялізацыі», ф-ка «Камінтэрн», Магілеўская шаўковая фабрыка і г. д.), большасьць ЦП саюзаў, гаркаапхарч і г. д. па сутнасьці засталіся ў баку ад сталінскага паходу і апартуністычна адносіліся да важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі за паляпшэньне рабочага снабжэньня, па-другое, што і заводзкія гарадзкія арганізацыі ня толькі не змаглі пасьля паходу працягваць барацьбу за паляпшэньне рабочага снабжэньня больш высокімі тэмпамі, але рэзка зьнізілі гэтыя тэмпы, ня здолеўшы накіраваць у арганізаванае рэчышча мабілізаваную ў дні паходу актыўнасьць мас.

2. Выходзячы з вопыту сталінскага паходу, з вопыту барацьбы за паляпшэньне рабочага снабжэньня перадавых маскоўскіх прадпрыемстваў, ЦК лічыць, што асноўным зьвяном у барацьбе заводзкіх арганізацый за паляпшэньне рабочага снабжэньня павінна быць барацьба за стварэньне ўласнай харчовай базы (прыгараднай гаспадаркі, сьвінарніка, трусатніка, малочнага стада, птушнікаў, якая зьяўляецца адной з важнейшых крыніц рабочага снабжэньня.

Арганізацыйная форма мабілізацыі мас на барацьбу за стварэньне ўласнай спажывецкай базы ўжо дана вопытам перадавых маскоўскіх прадпрыемстваў — гэта заводзкія харчовыя канфэрэнцыі.

ЦК прапануе ўсім РК і заводзкім арганізацыям правесьці да 20 жніўня харчовыя канфэрэнцыі на прадпрыемствах, якія маюць свой ЗРК.

3. Падрыхтоўка да харчовых канфэрэнцый павінна быць масавай кампаніяй. Заводзкія арганізацыі павінны выпрацаваць арыентовачны план харчовай базы (прыкладна, дабіцца на працягу году такога павялічэньня пагалоўя сьвіней, кароў, трусоў і г. д., якое-б забясьпечыла, скажам, штодзённую выдачу 100 грам мяса рабочаму і паўлітара малака з уласных заводзкіх харчовых рэсурсаў), паставіць яго на шырокае абгаварэньне мас, правесьці шэфства цэхаў над асобнымі галінамі харчовай базы. Заводзкая харчовая канфэрэнцыя і работа яе сэкцый павінна быць першым этапам гэтай шырокай мабілізацыі мас па барацьбу за стварэньне ўласнай базы.

ЦК абавязвае наркаматы, гаспадарчыя аб'яднаньні, ЦСПСБ і ЦП саюзу, БКС Белкаапхарч, гарадзкія раённыя партыйныя, савецкія і камсамольскія арганізацыі прыняць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні заводзкіх харчовых канфэрэнцый. У прыватнасьці, ЦК прапануе наркаматам і іх аб'яднаньням, ЦСПСБ і ЦП саюзаў, БКС і Белкаапхарч разам з заводзкімі арганізацыямі, якія маюць ЗРК, у дэкадны тэрмін прапрацаваць пытаньне аб іх фінансавым і арганізацыйным удзеле ў стварэньні моцных заводзкіх харчовых гаспадарак.

4. Барацьба за ўласную харчовую базу не павінна быць здарвана і не павінна аслабляць увагі заводзкіх арганізацый да пытаньняў паляпшэньня рабочага снабжэньня на сёпетні дзень. ЦК канстатуе рэзкае аслабленьне ўвагі заводзкіх арганізацый да самазагатовак.

ЦК канстатуе, што ў выніку недапушчальнага ігнараваньня ЗРК самазагатовак ў глыбінных пунктах, рэзка павысіліся цэны на мясныя абеды ў заводзкіх сталоўках раду прадпрыемстваў («Кастрычнік», Бабруйскі камбінат, «Бальшавік» і г. д.), што зьяўляецца зусім недапушчальным.

ЦК лічыць пытаньне барацьбы за зьніжэньне цэн на мясныя абеды ў заводзкіх сталоўках важнейшым палітычным пытаньнем і прапануе ўсім каапэрацыйным і заводзкім партыйным і прафэсыянальным арганізацыям прыняць зараз-жа рашучыя меры для арганізацыі такога роду самазагатовак у глыбінных пунктах, якія вялі-б да сыстэматычнага зьніжэньня цэн на мясныя абеды.

ЦК прапануе Наркамфіну ў пяцідзённы тэрмін праверыць факты празьмернага абкладаньня фінорганамі загатовак ЗРК і выдаць адпаведную інструкцыю фінорганам.

Камандзіраваць 15 адказных работнікаў (Белкаапсаюзу, ЦСПСБ і інш. арганізацый) для арганізацыі і правядзеньня заводзкіх харчовых канфэрэнцый. Агітмасадзелу падабраць указаных таварышоў у пяцідзённы тэрмін.

Забытае абяцаньне

(„Чырвоны абутнік", Менск)

Дзесяткі тысяч пар абутку, таго самага абутку, якога чакае рабочы спажывец, фабрыка сыстэматычна недадае краіне. 86.452 пары абутку — такава запазычанасьць фабрыкі за першае паўгодзьдзе. Лічба, скромна кажучы, не малая. Яна ярка паказвае, наколькі партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі **менскай абутковай фабрыкі** невыстарчальна змагаюцца за прамфінплян.

Адставаньне ідзе ня толькі па лініі колькасных паказальнікаў. З якасьцю справа хоць і лепшая, але **нездавальняючая.** У парадку сустрэчнага пляну фабрыка абавязалася давесьці процант адхіленьня ад першага гатунку да 10. Тым ня менш сярэдні процант адхіленьня ад першага гатунку дасягае амаль 15. Сваё слова фабрыка, як бачыце, забыла...

І так прадпрыемства ня выконвае свайго прамфінпляну. Яго запазычанасьць паранейшаму гапебна расьце, чым фабрыка непасрэдна б'е па рабочым снабжэньні. Ці думае фабрычная газэта **«Чырвоны абутнік»** над гэтымі пытаньнямі, ці разумее і адчувае яна сваю адказнасьць за адставаньне прадпрыемства? Камплекты газэты гаворяць на карысьць рэдакцыі.

У «Чырвоным абутніку» можна знайсьці даволі матар'ялаў, прысьвечаных змаганьню за прамфінплян. Газэту нельга таксама абвінаваціць у слабай ініцыятыўнасьці. Рэдакцыя праводзіць рабкораўскія рэйды, «мітынгі машын», зборы рабочых прапаноў і г. д. І ўсё-ж канкрэтных вынікаў гэтай работы ня відаць. Запазычанасьць прадпрыемства краіне, паўтараем, **расьце.** У чым справа?

... Некалькі месяцаў назад у Менску адбывалася ўсебеларуская канфэрэнцыя ўдарнікаў якасьці. Менская абутковая фабрыка ў падрыхтоўцы да канфэрэнцыі паказала ўзор баявой апэрацыйнай работы. Яна ўпарта змагалася за атрыманьне на канфэрэнцыі права настаўчага голасу. Вялікую, часьцяную жывым і глыбокім зьместам работу правяла і рэдакцыя «Чырвонага абутніка». Па яе ініцыятыве, напрыклад, быў арганізован рэйд па праверцы якасьці фабрычнай прадукцыі, у якім прымалі ўдзел 400 рабочых і інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў. У выніку гэтай падрыхтоўкі фабрыка

« ... АТРЫМАЛА ПРАВА ПАСТАНОЎЧАГА ГОЛАСУ НА КАНФЭРЭНЦЫІ ЎДАРНІКАЎ ЯКАСЬЦІ » («Чырвоны абутнік», № 9, 11 красавіка).

У газэце таксама было апублікавана ўрачыстае абяцаньне, што

« ... МЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА ПАВІННА БЫЦЬ І БУДЗЕ Ў ПЕРШЫХ РАДОХ ЗМАГАРОЎ ЗА ПРАМФІНПЛЯН, ЗА ЯКАСЬЦЬ».

На дзіва хутка гэта абяцаньне было забыта. Не прайшло і тыдню, як фабрыка замест «першых радоў» апынулася ў глыбокім і гапебным тыле. Скончылася канфэрэнцыя скончылася, відавочна і жаданьне фабрычных арганізацый ажыцьцявіць сваё слова. Лічбы выкананьня прамфінпляну рэзка пакаціліся ўніз. Красавік фабрыка скончыла з сур'ёзнай запазычанасьцю. Май — таксама. У чэрвені становішча яшчэ больш пагоршылася, як па колькасных, так і па якасных паказальніках. Сама газэта рашуча забіла трывогу:

«Паказальнікі выкананьня прамфінпляну за чэрвень, — пісаў 3 ліпеня «Чырвоны абутнік», — НЕДАПУШЧАЛЬНЫЯ, АСАБЛІВА ПА ЯКАСЬЦІ».

Адной трывогай, зразумела, справы ня вырашыш. Аднымі сыгналамі адставаньня не ліквідуеш. Патрэбны перш за ўсё (і ў гэтым **ГАЛОЎНАЕ)** сапраўдная мабілізацыя мас на барацьбу за прамфінплян, сапраўднае ажыцьцяўленьне 6 умоў перамогі — 6 указаньняў тав. Сталіна. Мала толькі пазабяцаць, што фабрыка «будзе ў першых радох змагароў за прамфінплян, за якасьць», каб жаданьне стала сапраўднасьцю.

Газэта рэзка б'е па дэмабілізацыйных настроях. Бяда, аднак, у тым, што «Чырвоны абутнік» далёка не заўсёды пачатую справу даводзіць да канца. Рэдакцыя іменна і забывае, што для ліквідацыі адставаньня мала толькі біць трывогу, толькі сыгналізаваць аб недахопах...

22 мая «Чырвоны абутнік» пісаў:

«Становішча з выкананьнем прамфінпляну за красавік і дзесяць дзён мая — ПАГРАЖАЮЧАЕ. За красавік трэба было выпусьціць 105.705 пар абутку, а выпушчана 76.560 (72,4 проц.). За першую дэкаду мая трэба было выпусьціць 29.610 пар, фактычна выпушчана 25.920 — 87,5 проц. пляну».

А вось і кароткая характарыстыка якасьці фабрычнай прадукцыі.

«Адхіленьне ад першага гатунку за 10 дзён мая дасягае 17,939 проц.» (амаль на тры процанты больш устаноўленай нормы, рэд.).

Вывады газэты:

«Трэба ні на мінуту не забываць, што мы ўжо вінаваты дзяржаве 72.622 пары абутку на 1 мая. Трэба таксама не забываць, што гэты абутак павінен быць палепшанай якасьці. Адступленьне неабходна зараз-жа спыніць і змагацца за поўнае выкананьне пляну другога кварталу».

Нішто сабе вывады, хоць і некалькі агульныя. Што-ж рэдакцыя робіць далей? Паказвае, як фабрыка змагаецца за прамфінплян, выкрывае слабыя бакі работы, пашырае вопыт лепшых брыгад і цэхаў?

Тут газэта дапускае сваю першую і самую асноўную памылку. Яна забывае, што змагацца за ліквідацыю адставаньня трэба **СЫСТЭМАТЫЧНА І АПЭРАЦЫЙНА.**

12 чэрвеня выйшаў новы нумар «Чырвонага абутніка», але ў ім... ні радка аб становішчы з выкананьнем прамфінпляну на фабрыцы. Чаму, што за прычыны, што за маўчаньне?

У маі газэта сыгналізуе аб «пагражаючым становішчы», б'е трывогу, патрабуе «спыніць адступленьне». Праходзіць 20 дзён. Мімаволі чакаеш, што газэта дасьць разгорнуты малюнак выкананьня прамфінпляну па фабрыцы, падагуліць першыя вынікі барацьбы за ліквідацыю адставаньня з тым, каб яшчэ больш мабілізаваць рабочыя масы вакол вузлавых пытаньняў прамфінпляну, узьняць іх па далейшы штурм праграмы першага паўгодзьдзя.

Нічога гэтага ў нумары **няма.** Газэта не дала нават ні аднэй апэрацыйнай зводкі. Як фабрыка ліквідуе сваю запазычанасьць, якія зьмены здыйсьніліся на фабрыцы, параўнальна з маем, што зроблена, каб «спыніць адступленьне»—застаецца тайнай. У газэце ёсьць толькі пара невялікіх заметак аб шэйным цэху. Ну, а іншыя?

На першай старонцы «Чырвоны абутнік» кідае лёзунг:

— МАШЫННАМУ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАМУ ЦЭХУ, ЯКІ ДАПУСЬЦІЎ АДСТАВАНЬНЕ, МАЦНЕЙ ТРЫМАЦЬ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ.

Якое адставаньне? У чым яно заключаецца? Што трэба зрабіць, каб прамфінплян цаньнямі. цэху быў поўнасьцю выкапан? Ня шукайце ў газэце адказу на гэтыя пытаньні. Апрача лёзунгу ні на першай, ні на другой і іншых старонках газэты аб машынным цэху нямаю **ні радка.** Вось і разумей, у чым тут справа!

Можа быць на фабрыцы ўсё добра і толькі пасобныя цэхі плятуцца ў хвасьце. Нічога падобнага. У наступным нумары (3 ліпеня) тон і настрої рэдакцыі рэзка мяняюцца. Газэта рантоўна зноў пачынае звяшць ва ўсе званы. Аказваецца, і ў чэрвені фабрыка працавала дрэнна. Плян ні па колькасных, ні, асабліва па якасных паказальніках **ня быў выканан.** Запазычанасьць зноў павялічылася. А газэта маўчала, газэта фактычна стаяла ў баку. «Чырвоны абутнік» забыў, што аднымі словамі і абяцаньнямі адступленьня ня спыніш...

Апошнія нумары газэты паказваюць, што ў рабоце рэдакцыі ёсьць пэўны зрух. «Чырвоны абутнік» ня дрэнна разгарнуў барацьбу за паляпшэньне культурна-бытавых умоў рабочых на фабрыцы. Газэта праводзіць пераклічку групаў-торгаў з мэтай выкрыць і зьнішчыць недахопы ў партыйна-масавай рабоце і г. д. Усё гэта, бязумоўна, патрэбная і важная справа, але толькі тады, калі кожная пераклічка ці рэйд, як і ўсякае іншае мерапрыемства даводзіцца да канца. Нельга адразу хапацца за ўсё, гэта прыводзе да паралдасьці, да бескарыснай шуміхі.

У «Чырвонага абутніка» такая небясьпека ёсьць. За апошні час, напрыклад, газэта адразу праводзіць 4 масавых мерапрыемстві: «мітынг машын», пераклічку групаў-торгаў, рэйд праверкі выкананьня 6 умоў тав. Сталіна, і нарэшце пераклічку гаспадарча-разрахунковых брыгад. **І ўсё гэта адразу.** Ці ня шмат?

Ня здіва, што рад важнейшых вузлавых пытаньняў, ад якіх залежыць лёс прамфінпляну, газэта і цяпер падае ў самым агульным, не канкрэтным тоне.

Напрыклад, 10 ліпеня «Чырвоны абутнік» на ўсю першую паласу дае лёзунг:

— НАДРЫХТАВАЦЦА ДА ВЫКАНАНЬНЯ ПАВЫШАНАЙ ПРАГРАМЫ — 4.340 ПАР У ДЗЕНЬ.

Ня думайце, аднак, што газэта паказвае як трэба падрыхтавацца, каб поўнасьцю забясьпечыць пасьпяховае выкананьне новай павышанай праграмы. Газэта абмяжоўваецца толькі адным лёзунгам. Камэнтары наўрад ці патрэбны.

* * *

Менская абутковая фабрыка забыла пра сваё абяцаньне ліквідаваць запазычанасьць краіне і даць рабочаму спажыўцу высокаякасны танны абутак. Слова, што фабрыка «будзе ў першых радох змагароў за прамфінплян, за якасьць», засталося толькі словам, ні больш. «Чырвоны абутнік», які пясе поўную адказнасьць за такое становішча, павінен рашуча і глыбока перабудаваць сваю работу.

Трэба ня толькі сыгналізаваць аб адставаньні, але і дабівацца ўпарта і пястомна, каб гэтае адставаньне на справе было ліквідавана, ня толькі абвінчаць рэйды, пераклічкі і праверкі, але і змагацца, каб яны далі канкрэтныя рэальныя вынікі. Абяцаньні не павінны больш заставацца толькі абяцаньнямі. **Спажывец чакае абутку!**

Рэйд-праверка прасоўваньня тавараў на вёску

ПАТОКІ ПРАМТАВАРАЎ—НАСУСТРАЧ УРАДЖАЮ

Умацаваць сельспажыўтаварыствы

БАРЫСАЎ.

У прасоўваньні тавараў на вёску па Барысаўскім раёне няма належнай гібкасьці і выразнасьці. Атрымаўшы цьвікі яшчэ ў ліпені, старшыня райспажыўсаюзу тав. **Рэмізаў** да гэтага часу ніяк ня можа вырашыць, куды і ў якой колькасьці накіраваць гэтыя цьвікі.

У плянаваньні завозу тавараў бываюць даволі кур'ёзныя выпадкі. 14 ліпеня прыбыла партыя ў 1.000 пасьценных гадзіньнікаў — «ходзікаў». Ня дрэнна. У вёсцы патрэбны гадзіньнікі і попыт на іх вялікі. Бяда толькі ў тым, што гэтыя самыя «ходзікі» пазбаўлены магчымасьці «хадзіць». **Тысяча гадзіньнікаў прысланы без адзінага маятніка.** Пасылаючы ў такім выглядзе гадзіньнікі, упаўнаважаны Белгандлю ў Маскве, **Лейзарзок,** як відаць, прытрымліваецца погляду, што па вёсцы яны патрэбны толькі для ўпрыгожваньня хат.

Аб гэтым абураючым факце райКК сыгналізавала адпаведным цэнтральным органам. У выніку 27 ліпеня дадаткова атрыманы маятнікі. Але каму гэта выгодна было трымаць на складзе тавар бяз руху на 15-20 тыс. рублёў на працягу 13 дзён?

Другі факт. Некалькі дзён назад прыбывае ваконнае шкло, як гэта значылася ў накладной. Шкло—вельмі патрэбны тавар на вёсцы. Але калі ўскрылі скрынкі, дык аказалася, што замест ваконнага шкла прыслалі грубое настольнае шкло.

У выніку прысылкі тавараў бяз уліку патрэбнасьці і асартымэнту, таваразварот замарожваецца.

Дрэнна адбіваецца на абслугоўваньні спажыўца адсутнасьць **развознага гандлю.** Пункты, у якіх знаходзяцца крамы, значна лепш абслугоўваюцца, чым вакольныя вёскі. Як правіла, атрыманы тавар хутка рэалізуецца, купляецца сялянамі тэй вёскі, у якой знаходзіцца крама, а калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі суседніх вёсак нават і ня ведаюць, калі і якія тавары паступаюць у крамы.

У практыцы рэалізацыі тавараў па мясцох маюць месца выпадкі грубага скажэньня дырэктыў аб савецкім гандлі. У крамах Навасельскага спажыўтаварыства пры продажы махоркі прымушаюць пакупнікоў купляць кнігі, ланці і г. д. «Хочаш курыць — купі ланцы».

Загадчык Глівенскай крамы — аматар простага тавараабмену. Ён у процілегласьць дырэктывам партыі аб савецкім гандлі практыкуе продаж мануфактуры толькі тым асобам, якія здаюць прадукты. Найбольшую здольнасьць па розных злоўжываньнях праяўляе загадчык Метчанскай крамы — **Бабіцкі.** Адпускаючы махорку, або мануфактуру, ён у якасьці абавязковага дадатку прымусова дае каробку пудры. Па думцы Бабіцкага, «касмэтыцы ўсе ўзросты маюць». Але гэтым «дзейнасьць» Бабіцкага ня вычэрпваецца. Калі атрымліваецца абутак або вопратка, ён абавязкова лепшы тавар захоўвае пад лаўкай «для знаёмых». 24 ліпеня ў краму прывезлі партыю тавараў — боты, бацінкі, паліто і інш. Стварылася чарга. Падыходзіць сакратар камсамольскай ячэйкі купіць сабе бацінкі.

— Як у цябе з паем?

— Пай поўны.

— Ну, дык гані хутчэй мэтавы ўклад, тады будзем прымяраць бацінкі.

А ў гэты-ж час пара жаночых бацінак аказалася ўжо на руках у былога арэндатара млыну Мазо, які не зьяўляецца членам каапэрацыі. Па наведзенай брыгадай «Зьвязды» і райКК даведцы, гэтыя бацінкі адпушчаны пават бяз грошай, у крэдыт.

У правядзеньні рэйду-праверкі прасоўваньня тавараў на вёску, апрача брыгады «Зьвязды», райКК і «Бальшавіка Барысаўшчыны» прымалі ўдзел і сельскія сэкцыі РСІ. Выкрытыя факты скажэньня савецкага гандлю выпраўляліся на мясцох.

Неабходна неадкладна **ўмацаваць нізавую сетку спажыўкаапэрацыі,** каб забясьпечыць сапраўдную перабудову яе работы і пераўтварыць сельспажыўтаварыствы з «пунктаў мэханічнага разьмеркаваньня цэнтралізаваных фондаў» у ініцыятыўныя баявыя зьвенні савецкага гандлю.

Брыгада «Зьвязды», райКК і «Бальшавіка Барысаўшчыны»: ІВАШЫН, БУЗО, КАЗЛОЎСКІ, ЛІХАЧЭЎСКІ, САНЬКО, СІДАРЭНКА, ХОМІЧ, ХАЦКЕВІЧ, ПАШНОЎ, КУСЬЦЯРОЎ.

Тавар для вёскі ляжыць на базах

ВОРША.

Ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прызнаў становішча сустрэчнага гандлю і прасоўваньня прадметаў шырспажыву на вёску ўсім нездавальняючым.

Праверка выкананьня дырэктыў пленуму па Аршаншчыне паказала, што прасоўваньне тавараў на вёску не пастаўлена, як важнейшая задача, а зьведзена фактычна да тэхнічнага мерапрыемства.

Да гэтага часу не разгорнута барацьба за пасканьне таваразвароту, за сапраўднага савецкага гандлю. У Багушэўскім і Крапівенскім сельспажыўтаварыствах калгасьнікам і працоўным аднаасобнікам пры продажы тавараў навязваюць прымусовы асартымэнт.

Тавары вельмі часта замарожваюцца на складах і базах. На базе Белкаапсаюзу замарожана 300 скрынак простага мыла. 25 ліпеня атрымана яшчэ 100 скрынак. Ляжыць яшчэ і рад іншых тавараў. У тойжа час Вушацкі, Талочынскі і Дубровенскі райсаюзы недаатрымалі тавараў на 18 тыс. руб. Яшчэ горш з рэалізацыяй мэблі. **На базе ляжыць каля 20 вагонаў мэблі.**

Ня гледзячы на такую загружанасьць склада, база Белкаапсаюзу ўсё дае заяўкі на тавары. Нядаўна атрымана 25 вагонаў лямпавага шкла.

Непаваротлівасьць праяўляе ня толькі спажывецкая каапэрацыя, але і сыстэма Белгандлю. На 1 жніўня на складах Белгандлю ў Воршы было 12 скрынак абутку, 11 скрынак гатовай вопраткі, 20 скрынак махоркі, вяроўкі і г. д.

Копыськая крама Белгандлю ўсё яшчэ працуе па-старому і замест разгортваньня савецкага гандлю, займаецца мэханічным разьмеркаваньнем тавараў. Крамнік заяўляе пакупнікам: «Калгасьнікам і рабочым саўгасаў тавары адпускаюцца па сьпісах, якія прадстаўляюцца праўленьнямі калгасаў і адміністрацыяй саўгасаў. Аднаасобнікам тавары адпускаюцца па даведках сельсаветаў аб тым, што здана збожжа дзяржаве ў парадку загатовак».

Вось як бюракраты з крамы Белгандлю выконваюць дырэктывы партыі аб савецкім гандлі. Трэба навучыць работнікаў сыстэмы Белгандлю як прасоўваць тавары шырспажыву на вёску, як гандляваць па-савецку. Тых-жа, хто скажае прынцыпы савецкага гандлю, трэба прыцягваць да суровай адказнасьці.

Бюро райкому партыі на апошнім пасяджэньні прыняло рад канкрэтных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі ў галіне завозу тавараў шырокага спажыўваньня ў вёску. Неабходна толькі паладзіць пастаянны кантроль за работай усёй таваразводзячай сеткі, аказваючы ёй практычную дапамогу.

Л. П.

На складах поўна, у крамах пуста

ШКЛОЎ.

Райспажыўсаюз ня цікавіцца хутчэйшым прасоўваньнем тавараў шырспажыву ў вёску. Ён сваячасова не паведамляе сельспажыўтаварыствам аб атрыманых таварах. У выніку апошнія залежваюцца. На базе доўгі час знаходзяцца 4 бочкі рыбы, 18 скрынак гуталіну, 7 скрынак махоркі, 300 кгр. шпагату, 30 ватных куртак, 40 летніх гарнітураў, 8 скрынак соды, 90 кгр. вяровак, 7 тэрмосаў.

На базе замарожана каля 22 скрынак цьвікоў. Райспажыўсаюз трымае іх для будаўніцтва трусатніка і квасільнага пункту. Але будаўніцтва да гэтага часу не разгорнута і наогул невядома, калі яно пачнецца.

Белгандаль замарожвае ходкія прадметы больш, чым на 7 дзён. На яго складзе ляжыць 2 892 мэтры мануфактуры, 72 пары галёш, 197 пар бялізны, 5.000 алюміневых лыжак, 8 скрынак запалак і адна скрыня мыла.

У той-жа час у вясковых крамах зусім няма тавараў.

Райспажыўсаюзу і аддзяленьню Белгандлю неабходна ўмацаваць сувязь з нізавой сеткай, паскорыць таваразварот і поўнасьцю ліквідаваць выпадкі замарожваньня тавараў на складах і базах.

Ц. Васіль.

Кузьняцоў—самаснабжэнец і зрыўшчык калгаснага гандлю

ДУБРОЎНА.

У той час, як партыя і ўрад ставяць пытаньне аб разгортваньні калгаснага гандлю ў цэнтры ўвагі ўсіх партыйных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый, райспажыўсаюз, на чале з **Кузьняцовым,** злачынна зрывае гэтую важнейшую справу.

Замест прасоўваньня тавараў шырокага спажываньня ў вёску, на калгасны рынак, райспажыўсаюз тыдні марыную іх на сваіх складах. На апошніх ляжыць бяз руху гарнітураў на 6.000 руб., паліто — на 2.000 руб., абутку і галёш — на 9.000 рублёў і інш., усяго на суму 20.000 руб. Атрыманая нядаўна **мануфактура на 9.500 руб. для вёскі разбазарана не па прызначэньні.**

Старшыня райспажыўсаюзу Кузьняцоў займаецца самаснабжэньнем і, апрача таго, выдаў сваім знаёмым каля 250 кгр. шпалічнай мукі, 45 кгр. цукру і інш.

Гэтым далёка ня вычэрпваецца ўвесь размах «дзейнасьці» Кузьняцова.

Прадстаўнік рэспубліканскай пракуратуры, які прыехаў у Дуброўна, павінен дэтальна выявіць усю работу райспажыўсаюзу, усе злачынныя ўчынкі Кузьняцова і паказаць іх перад шырокай масай працоўных раёну.

Самаснабжэнцы і зрыўшчыкі калгаснага гандлю, якія засеялі ў райспажыўсаюзе, павінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці.

Рэліна, Слуцкі.

Дырэктар швэйнай фабрыкі зьняты з работы

Загад па Народным Камісарыяце лёгкай прамысловасьці БССР

За невыкананьне майго распараджэньня аб перадачы аўтамашыны быхаўскай гуце «Ільіч» для вывазу прадукцыі шырокага спажываньня з заводу, чым была сарвана сваячасовая адгрузка, зьняць з работы дырэктара магілеўскай швэйнай фабрыкі імя **Валадарскага тав. Гарэліка** з апублікаваньнем у друку.

Часовае выкананьне абавязкаў дырэктара фабрыкі ўскладаю на намесьніка дырэктара тэй-жа фабрыкі тав. **Партнога.**

Бешкэйаб'яднаньню ў пяцідзённы тэрмін прадставіць кандыдатуру на месца тав. Гарэліка для зацьвярджэньня наркамлёгпрамам.

Тав. **Партному** безадкладна выканаць гэты загад і далажыць мне.

Нарком лёгкай прамысловасьці — ГРЫСЭВІЧ.

РАЗГОРТВАНЬНЕМ ШЫРОКАЙ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ НА ВЁСЦЫ—ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПАСЬПЯХОВУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ

Рэалізацыя пазыкі „4 заключнага" на вёсцы

(у процантах на 1 жніўня 1932 г.)

№№ па ч.	Назва раёнаў	Па калгасн. сэктары	Аднаасобным сэкт.	Разам
1.	Клімавіцкі	121,0	1,3	91,9
2.	Мсьціслаўскі	119,4	27,0	82,9
3.	Дзяржынскі	97,0	2,0	65,3
4.	Заслаўскі	100,0	—	65,0
5.	Лёзьнянскі	109,6	8,8	64,0
6.	Аршанскі	98,8	1,0	61,4
7.	Жыткавіцкі	87,5	5,0	60,6
8.	Крычаўскі	93,3	—	51,5
9.	Сіроцінскі	100,7	1,4	48,8
10.	Лагойскі	98,8	3,3	48,2
11.	Лепельскі	55,6	—	45,5
12.	Чэрыкаўскі	67,8	—	44,6
13.	Слуцкі	82,2	1,9	44,2
14.	Старобінскі	100,0	8,4	43,0
15.	Камарынскі	86,0	—	39,1
16.	Полацкі	79,1	1,5	35,8
17.	Ельскі	77,5	—	35,4
18.	Мазырскі	76,0	13,7	33,7
19.	Касьцюковіцкі	39,2	3,9	32,8
20.	Дрысенскі	60,0	2,9	32,4
21.	Дубровенскі	75,0	0,6	31,0
22.	Вушацкі	50,5	1,3	29,8
23.	Шклоўскі	62,2	0,6	29,8
24.	Крупскі	58,6	—	28,6
25.	Любаньскі	60,0	7,2	27,1
26.	Горацкі	58,9	—	25,9
27.	Пленчаніцкі	60,0	—	25,0
28.	Чырвонапольскі	49,1	0,9	23,6
29.	Брагінскі	55,6	1,1	23,5
30.	Парыцкі	84,6	1,6	23,2
31.	Церахаўскі	60,8	0,8	23,1
32.	Б.-Кашалёўскі	55,0	1,1	22,7
33.	Бягомльскі	22,6	22,2	22,5
34.	Вузьдзенскі	34,6	—	21,1
35.	Лоеўскі	47,1	—	20,8
36.	Магілеўскі	61,2	0,3	20,8
37.	Клічаўскі	56,8	3,3	20,7
38.	Смалявіцкі	62,9	2,1	20,4
39.	Тураўскі	56,3	—	20,0
40.	Барэзінскі	54,9	1,1	19,4
41.	Барысаўскі	51,1	0,8	18,7
42.	Жлобінскі	66,0	1,3	18,6
43.	Чэрвеньскі	67,3	1,3	18,4
44.	Сурскі	48,7	2,0	18,0
45.	Расонскі	68,9	0,8	18,0
46.	Лельчыцкі	57,1	8,9	18,0
47.	Рагачоўскі	65,3	0,7	16,9
48.	Глускі	45,0	1,9	16,5
49.	Бялыніцкі	30,6	—	16,5
50.	Кармянскі	39,0	0,7	15,8
51.	Капыльскі	27,1	0,8	15,1
52.	Асіповіцкі	45,2	0,6	15,0
53.	Чырвонаслабодзкі	73,7	1,1	14,1
54.	Пятрыкоўскі	41,7	2,8	13,7
55.	Талочынскі	23,3	0,6	13,5
56.	Гарадоцкі	31,3	0,7	13,5
57.	Старадароскі	60,0	0,7	13,2
58.	Чавускі	44,8	0,3	13,1
59.	Чашніцкі	22,6	1,0	12,8
60.	Прапойскі	21,7	0	12,3
61.	Сенненскі	18,7	1,0	12,2
62.	Бешанковіцкі	24,0	0,8	12,1
63.	Пухавіцкі	8,2	2,3	11,7
64.	Асьвейскі	20,7	2,0	11,3
65.	Беткаўскі	40,8	1,0	11,1
66.	Чачэрскі	29,4	—	9,9
67.	Рэчыцкі	28,0	—	9,6
68.	Нараўлянскі	32,7	0,7	9,6
69.	Быхаўскі	24,4	—	9,2
70.	Бабруйскі	36,7	0,3	9,1
71.	Хойніцкі	15,2	0,5	7,1
72.	Уваравіцкі	9,0	—	2,9
	1. Біцебскі	92,7	9,4	65,6
	2. Менск	80,9	7,2	54,2
	3. Гомель	57,2	—	24,0
	Разам па БССР	**59,9**	**2,0**	**27,3**

УВАГА: Зьмяншэньне процанту рэалізацыі пазыкі па аднаасобным сэктары тлумачыцца тым, што зараз раёны паказваюць выключна паступленьне наяўных грошай, рапей-жа паказвалася папярэдняя падпіска.

Змагаючыся за сканчэньне падпіскі, зьвярнуць асаблівую ўвагу на яе афармленьяе

Выкананьне пляну рэалізацыі пазыкі па сялянскім сэктары на 1-га жніўня па 27,3 проц. гаворыць амаль аб поўным правале важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніі.

Большая частка раённых партыйных і савецкіх арганізацый недаацанілі ўсёй важнасьці сваячасовай рэалізацыі пазыкі, пусьцілі яе на самацёк.

Фінансава-крэдытныя органы не згуртавалі вакол гэтай работы шырокай грамадзкай думкі. Па некаторых раёнах кампанія да гэтага часу зусім не разгорнута. **Уваравіцкі** раён па сялянскім сэктары рэалізаваў пазыкі на 2,9 проц., **Хойніцкі** — на 7,1 проц., **Нараўлянскі** — на 9,6 проц., **Бабруйскі** — на 9,1 проц., **Рэчыцкі** — на 9,6 проц. і г. д.

Такія раёны, як **Бялыніцкі, Чачэрскі, Быхаўскі, Вузьдзенскі** і інш. сярод аднаасобнага сялянства не рэалізавалі ніводнага рубля.

Аб чым гэта сьведчыць? Аб тым, што гэтых раёнах сярод працоўных сялян аднаасобнікаў не праводзяць ніякай растлумачальнай работы.

Шырока разгорнутая калектывізацыя вё

Крывавая хваля фашысцкага тэрору ў Германіі

Новыя тэрарыстычныя акты

БЭРЛІН 6. Зноў быў зроблен рад замахаў у розных гарадох Германіі. Усе замахі ў розных месцах Германіі былі зроблены ў адзін час. Гэты факт лішні раз даказвае, што тут справа ідзе **аб сыстэматычна падрыхтаваных тэрарыстычных актаў.**

У **Офэнбаху** кінута ручная граната ў біржу працы. Адбыўся моцны выбух, які нанёс сур'ёзныя пашкоджаньні самой біржы працы і на прылеглых вуліцах.

У **Браўншвэйгу** ў рабочым раёне Альтштадт выбухам дынаміту **пашкоджан 21 дом.** Выбух быў такі моцны, што ў рабочых кварталах пашкоджана ўся мэбля. Есьць шмат лёгка параненых.

У **Брэслаўлі** зроблен замах на работніка рэфармісцкіх прафсаюзаў, аднаго з лідараў групы Зэйдэвіц — Экштэйна. У кватэру Экштэйна праз вакно была кінута ручная граната. Уся абстаноўка кватэры разбурана. Экштэйну ўдалося ўцалець. У **Швэрыне** зроблен замах па памяшканьне рэдакцыі сацыял-дэмакратычнай газэты «Фрэйес-Ворт». Будынак моцна пашкоджан.

У **Кілі** зроблен замах на гандлёвы дом Карштадт. Выбухам пашкоджаны як гэты дом, так і прылеглыя магазыны.

У **Шуме** недалёка Крэйцбурга кінута ручная граната ў кватэру старшыні каталіцкай царкоўнай рады. Апошні ўжо ня раз атрымліваў ад нацыянал-сацыялістаў пагражаючыя ананімныя лісты.

У **Віршы** зроблен замах на кватэру аднаго рэвалюцыйнага рабочага. Выбухнуўшая граната не зрабіла вялікіх пашкоджаньняў.

Прыбыўшы ў Кенігсбэрг упаўнаважаны ўрадавага камісара ня можа выраішыць, якому суду падпадаюць нацыянал-сацыялісты, якія зрабілі замах у Кенігсбэргу, — ці суду прысяжных, ці спрошчанаму скораму суду. Калі справа датычыць рэвалюцыйных рабочых, дык улада дзейнічае больш шпарка.

Кампанія супроць Клары Цэткін

БЭРЛІН. Уся фашысцкая і напаўфашысцкая праса пачала шалёнае ўкаваньне Клары Цэткін у сувязі з тым, што Цэткін, якая зьяўляецца старэйшым па ўзросьце членам новага рэйхстагу, паводле статуту, павінна быць старшынёй на першым пасяджэньні рэйхстагу да абраньня новага старшыні. Блізкая да ўраду «Бэрлінэр Бэрзэцэйтунг» зазначае, што члену партыі, які знаходзіцца па-за законам, няма чаго шукаць месца, якое належыць старшыні рэйхстагу. Нацыянал-сацыялістычны «Ангрыф» заяўляе, што для рэйхстагу германскага народу будзе ганьбаю, калі «яўрэйка, якая жыве ў Маскве і дзейнічае па даручэньні Масквы, адкрые рэйхстаг».

ПАЎСТАНЬНЕ УКРАІНСКІХ СЯЛЯН У ЛІСКІМ ПАВЕЦЕ

(Ліст са Львова).

Горны Ліскі павет у Заходняй Украіне, акупаваны фашысцкай Польшчай, 20 чэрвеня зрабіўся арэнай шырокага сялянскага паўстаньня. Каб задушыць сялянскія выступленьні, польская ўлада сьцягнула сюды паліцэйскія сілы з суседніх гарадоў: Самбора, Сянова, Львова. Супроць бяззбройнага населяньніцтва акрамя паліцыі былі кінуты **4.000 войска і эскадрыльля самалётаў.** Пачалася «пацыфікацыя» галодных сялянскіх мас, якая ні на хвіліну ня спынецца з 1930 г. **Есьць дзесяткі забітых і параненых, сотні арыштаваных і катаваных па дэфэнзывах.** Арыштаваным пагражаюць ваенна-палявыя суды і шыбеніцы. Сяляніства хаваецца ў лясох і наперакор афіцыяльным паведамленьням пра «спакой» —змагаецца далей.

Што сталася, што «лёяльны» да гэтага часу, паводле ўрадавых запэўненьняў, «хлоп» пачаў віламі і косамі гнаць вон акупантаў?

Заходняя Украіна ўжо перад імпэрыялістычнай вайной была найбольш аграрна-перанаселенай краінай у Эўропе. Аднак, гата не перашкодзіла імпэрыялістычнай Польшчы пасьля акупацыі 1919-20 году насадзіць на Заходняй Украіне **80.000 цывільных і вайсковых калёністаў,** так званых «асаднікаў», абрабаваць украінскае насельніцтва на сотні тысяч гэктараў зямлі. Зімой бягучага году польскі сойм ухваліў **новы закон пра далейшую калёнізацыю 90.000 вайсковых асаднікаў на акупаваных заходня-украінскіх і заходня-беларускіх землях.**

Лясны промысел, з якога амаль выключна жыло насельніцтва гэтага павету, зараз пры панаваньні акупантаў амаль зусім замёр. Заняпала дробная прамысловасьць. Закрыты аддзіны ў Ліскім павеце, ва **Устрыках,** завод па ачыстцы нафты. Вялікая фабрыка на вырабе вагонаў у Сяноку, дзе раней працавала некалькі тысяч рабочых, зараз амаль закрыта. Працуе толькі 200 чал. два-тры дні ў тыдзень. Адначасова расьце падатковы цяжар.

Урад крывавага Пілсудзкага, каб утрымліваць сваю інтэрвэнцыйную армію і акупацкі апарат, прымушан сьцягваць з прадоўных усё новыя і новыя падаткі.

На вёсцы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі **паліцэйскі стаў панам жыцьця і сьмерці селяніна.** Банды «Стральца» тэрарызуюць, грабяць і б'юць беспакарана украінскае насельніцтва. Эксплёатацыя пэмецкімі вясковай беднаты дасягнула нячуваных памераў. За 14-гадзінны дзень працы на фальварках—**50-70 грошаў. Коштам бясплатнай прымусовай працы старацца фашысцкі ўрад будаваць ваенныя шляхі і дарогі, шашы для панскіх дваро́ў.**

Кроплю, якая перапоўніла меру цярпення сялян Ліскага павету, быў намер графа Патоцкага і старосты з Ліско прымусіць галодных сялян **рамантаваць бясплатна графскую дарогу, за карыстаньне якой яшчэ з 1926 году з сялян браліся падаткі.** 20 чэрвеня зьявіўся ў вёску **Берагі граф Патоцкі** і староста **Вергштай** і пагрозамі пачалі прымушаць сялян згадзіцца на «сьвята працы», г. зн. на бясплатную перабудову панскай дарогі. Сяляне адмовіліся ісьці працаваць.

Калі на другі дзень—21 чэрвеня зьявіўся на вёсцы інжынэр Зэмба і разам з адміністрацыяй графскіх лясоў пачалі ў школе распрацоўваць плян работ, сяляне патрабавалі ад Зэмбы, каб ён пакінуў вёску.

Азьвярэлыя агенты акупантаў у адказ на гэта пачалі страляць у натоўп. Некалькі чалавек паранена. Разлаваная маса з крыкамі: «пашчыну заводзіце, будзеце страляць у нашу працу, за падаткі», разагнала панскіх прыслужнікаў і зьбіла да сьмерці Зэмбу, якому не дапамог і рэвальвэр. Выкліканая паліцыя пры дапамозе «Стральца» пачала «пацыфікацыю», арыштоўваючы сялян. Гэта яшчэ больш разлавала сялянскую масу. Паўстаньне ахапіла вёскі Целясьніцу, Сапно, Райскае, Лабужно, Лазіну і інш.

Разам з украінскімі сялянамі паўстала і польская вясковая беднота. У некаторых вёсках сяляне прагналі войтаў. Пачалася расправа з акупантамі. У вёсцы Лабужна зьбілі рымска-каталіцкага ксяндза Цяцеру, у фальварку ля вёскі Бобрка параніл**і абшарніка Якубоўскага і двух арэндатараў фальварку.** У адной вёсцы разэброілі трох паліцэйскіх. **Сяляне, узброеныя віламі, матыгамі, а некаторыя і агнястрэльнай зброяй, арганізаваліся ў атрады, занялі дарогі і пачалі нападаць на фальваркі.**

1 ліпеня значныя атрады мабілізаванай з цэлай акругі паліцыі пачалі наступленьне на паўстаўшыя вёскі. **У Целясьніцы сялянская маса ў 6.000 чалавек,** падпусьціўшы блізка атрад паліцыі, **атакавала яго каменьнямі.** Адбылася жорсткая сутычка, у рэзультаце якой **5 сялян забіта, 8 паранена і паранены два паліцэйскія.** Разьбітыя сялянскія атрады рассыпаліся па гарах і лясох і змагаліся далей. Каб задушыць паўстаньне, акрамя вялікіх атрадаў паліцыі, **акупанты кінулі 4.000 войск і два самалёты. Турмы перапоўнены.** У адным толькі Сяноку было пасаджана звыш 500 чалавек.

Карныя атрады войска і паліцыі ачысьцілі паўстаўшы раён ад сялянскіх атрадаў, пікота туды не прапускаюць, акрамя украінскіх буржуазных паслоў, якія па заданьні польскага фашызму пасьпяшаліся на месца падзей «супакойваць» сялян і пераконваць іх, каб выдалі «камуністычных агітатараў» і пакаяліся ўладзе графаў Патоцкіх.

Да 9 ліпеня фашысцкая ўлада не магла задушыць сялянскага паўстаньня ў Ліскім павеце. («Камуніст»).

Усеагульная забастоўка камунальных рабочых у Львове

ВАРШАВА, 6. Уночы з 3 на 4 жніўня ў **Львове выбухнула забастоўка ўсіх рабочых гарадзкіх прадпрыемстваў.** Прычынай забастоўкі зьявілася **спроба магістрату зьнізіць зарплату на 10 проц., скараціць водпускі, значна пагоршыць умовы працы рабочых.** Для задушэньня забастоўкі неадкладна былі мабілізаваны войскі. Вайсковыя часьці занялі электрастанцыю, газавы завод, водаправод і інш. гарадзкія прадпрыемствы.

Паведамляючы аб забастоўцы камунальных рабочых у Львове, «ілюстраваны Курэр Цодзенны» піша, што забастоўка мае палітычны і эканамічны характар. На ініцыятыве саюзу легіянэраў, страляковага саюзу і афіцэраў рэзэрву створан камітэт, які **запрапанаваў сваіх членаў у якасьці штрэйк брэхэраў.** Прапанова матывуецца неабходнасьцю замяніць салдат, якія **зьяўляюцца ім досыць надзейным элемэнтам.**

«Слова польске» **паведамляе, што кіраўніцтва забастоўкаю гарадзкіх рабочых знаходзіцца ў руках забастовачнага камітэту, якім кіруюць камуністы.**

Белагвардзейскія гнёзды ў Стамбуле

СТАМБУЛ. Газэта **«Вакыт»** публікуе сьпіс працуючых у Стамбуле белагвардзейскіх арганізацый. Газэта ўказвае, што ў Стамбуле працуюць аддзяленьне мілераўскага агульна-вайсковага саюзу, аддзяленьне тэрарыстычнага **«Брацтва рускай праўды»,** саюз інвалідаў, прадстаўніцтва Кірыла Уладзіміравіча, дзьве другія манархічныя групы, прадстаўніцтва белагвардзейскага «ўраду» Украіны і інш.

Паводле слоў газэты, найбольшую небясьпеку прадстаўляюць сабой **агульна-вайсковы саюз і «Брацтва рускай праўды».** Белагвардзейскія арганізацыі Стамбулу атрымліваюць указаньні і сыстэматычна інструктуюцца белагвардзейскімі цэнтрамі, якія зьвілі сабе гняздо ў Парыжы. У прыватнасьці, белагвардзейцы атрымліваюць дырэктывы ад сыстэматычна наяжджаючага ў Стамбул пад відам прадстаўніка французкіх аўтамабільных фірм — генэрала **Сакрэцьева.**

Закранаючы характар дзейнасьці рускіх белагвардзейцаў у Стамбуле, газэта адзначае, што **белагвардзейцы займаюцца шпіянажам, распаўсюджваюць манархічную і тэрарыстычную літаратуру і царскія партрэты, дзейнічаюць у цесным кантакце з армянскай контр-рэвалюцыйнай партыяй дашнакаў.**

Заканчвае «Вакыт» абураным пытаньнем: **«Як адважваюцца белагвардзейцы так злоўжываць нашай гасьціннасьцю? Паліцыя і жандармерыя павінны сур'ёзна заняцца імі».**

Рыхтавацца да новага навучальнага году

Загадчыкам культпропаў, ГК і РК КП(б)Б

Падрыхтоўка да новага навучальнага году ў большасьці раёнаў праходзіць яўна нездавальняюча. Вакол гэтай важнейшай справы не згуртавана патрэбная ўвага партыйных, савецкіх, прафэсыянальных, камсамольскіх і гаспадарчых арганізацый, ня прыцягнута на дапамогу шырокая пралетарская грамадзкасьць.

Між тым, ад падрыхтоўкі да новага навучальнага году залежыць якасьць працы школ у 1932-33 навучальным годзе і пасьпяховая падрыхтоўка пэдкадраў.

Культпроп ЦК КП(б)Б прапануе загадчыкам культпропаў, ГК і РК КП(б)Б узяць над свой непасрэдны нагляд і кіраўніцтва падрыхтоўку да новага навучальнага году, мабілізаваўшы шырокую пралетарскую грамадзкасьць на выраішэньне наступных задач: скончэньне будаўніцтва і рамонту школ і памяшканьняў навучальных устаноў; пашырэньне школьнай плошчы за кошт вызваленьня і перадачы школам былых школьных будынкаў, пабыцьцё новага і рамонту старога інвэнтару і абсталяваньня; улік тых, што падлягаюць абавязковаму навучаньню; камплектаваньне школ і навучальных устаноў пэдкадрамі і правядзеньне вярбоўкі адпаведных кантынгентаў у пэдустановы; забесьпячэньне школ і пэдустаноў неабходным аладам на ўвесь 1932-33 навучальны год; забесьпячэньне школ падручнікамі, навучальнымі прыладамі, спытамі, алоўкамі; папаўненьне школ і пэдустаноў палітэхнічным і лябараторным абсталяваньнем, правядзеньне рамонту сталовак і кухань з мэтай арганізацыі грамадзкага харчаваньня для студэнтаў і гарачых сьпеданьняў для вучняў і мабілізацыя для гэтай мэты неабходных натуральных і грашовых фондаў.

Для выраішэньня ўсіх гэтых задач Культпроп ЦК КП(б)Б прапануе шырока скарыстаць абвешчаны на лініі НКА конкурс на лепшую падрыхтоўку школ і пэдустаноў да новага навучальнага году, забясьпечыўшы ўключэньне ў конкурс усіх грамадзкіх арганізацый, а таксама саміх школ і пэдустаноў.

Нам. загадчыка Культпропу ЦК КП(б)Б — ЗАЛАТУХІН.

Бязьдзейнасьць камгасу, райана і сельсаветаў

Шклоўскі раёна, недацаніўшы важнасьці своячасовай падрыхтоўкі да новага навучальнага году, не разгарнуў работы па падрыхтоўцы да яго. Загадчык раёна НОВІКАЎ пашоў у адпачынак, а яго намесьнік КАВАЛЁЎ нічога ня робіць, толькі чытае «важныя» цыркуляры.

У выніку бязьдзейнасьці раёна і астатнія арганізацыі і ўстановы нічога ня робяць.

Гарсавет і камгас зусім не клапоцяцца, каб падрыхтаваць школьныя памяшканьні. У канцы красавіка месяца былі агледжаны школы для рамонту, усё зэпісана... і далей справа не пайшла.

Пачатая будавацца ў горадзе ФЗС, скончана толькі напалову, рамонт ШКМ не распачат. А трэба адрамантаваць печы, пашкліць вокны, адрамантаваць дошкі і лаўкі.

Шклоўскі гарсавет маркуе перанесьці 2-ю савецкую школу ў будынак польскай сямігодкі, а польскую сямігодку ў будынак 2-й савецкай школы. Гэта пытаньне канчаткова яшчэ ня вырашана і рамонт гэтых школ затрымліваецца.

Яшчэ горш стаіць справа па сельсаветах. Тут мы сустракаемся з простай недавацэнкай падрыхтоўкі да навучальнага году.

У СЬЛІКОЎСКІМ сельсавеце, напрыклад, да рамонту зусім яшчэ ня прыступлена. У ГАРАДЗІШЧАНСКІМ сельсавеце для ШКМ быў аддан кулацкі будынак. Калі загадчык пашоў аглядаць яго, дык аказалася, што гэты самы дом яшчэ раней аддан калгасу «Новы шлях», які яго і перавёз.

Зусім недапушчальнае становішча з забесьпячэньнем школ апалам, асабліва па гор. Шклову, дзе ні адна школа апалам не забясьпечана. Адказ гарсавету і райвыканкому лёгкі і кароткі—«апалу няма».

У Шклоўшчыне ня ўлічаны недахопы мінулага навучальнага году, калі ў шмат лікіх школах раёну зрываліся заняткі (РЫЖКАЎСКІ і інш. сельсаветы) з-за нязробленага рамонту і дрэннага забесьпячэньня апаламі.

НЕАБХОДНА ЗАРАЗ-ЖА ПЕРАКЛЮЧЫЦЦА НА ЎДАРНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ, МОЦНА ЎДАРЫЦЬ ПА БЮРАКРАТАХ І ГУЛЬТАЁХ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ БУДАЎНІЦТВА САВЕЦКАЙ ПАЛІТЭХНІЧНАЙ ШКОЛЫ.

Ц. ВАСІЛЬ.

У Рагачове яшчэ не пачыналі...

РАГАЧОЎ. Забесьпячэньне своячасовага скончэньня будаўніцтва і рамонту школ — на сёньня важнейшая задача падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Між тым, ня гледзячы на пастанову СНК БССР аб разгортваньні школьнага будаўніцтва і на неаднаразовыя ўказаньні РВК, значная частка сельсаветаў і калгасаў раёну праяўляюць недапушчальную непаваротлівасьць і бязьдзейнасьць у разгортваньні будаўніцтва і рамонту школ.

Да пачатку новага навучальнага году па раёне павінна быць адрамантавана 65 школьных будынкаў і забясьпечана своячасовае адкрыцьцё 13 новых сямігодак. У якім становішчы знаходзіцца зараз рамонт школ — НІ РАЙКАЛГАССАЮЗ, НІ РАЙАНА НЯ ВЕДАЮЦЬ. Сродкі, адпушчаныя для рамонту, да школ яшчэ не даведзены і ЛЯЖАЦЬ У БАНКУ НЕСКАРЫСТАНЫМІ.

Да восені бягучага году павінна быць скончана пабудова СЬВЯЦКАЙ школы сямігодкі. Але непаваротлівасьць і нежаданьне Сьвяцкага сельсавету па-баявому ўзяцца за гэту работу тармозіць ход будаўніцтва і ставіць яго пад пагрозу зрыву. Адпушчаныя яшчэ ў лютым месяцы лесаматэрыялы сельсавет не паклопаціўся нават вывезьці.

Ня скончана пабудова і Азеранскай школы, ня гледзячы на тое, што будаўніцтва распачата некалькі год таму назад. (БЕЛТА).

На прадпрыемствах Віцебшчыны праверка калдагавароў недапушчальна зацягнулася

Да 1 жніўня прафарганізацыі разам з гаспадарчымі органамі, згодна дырэктывы ЦСПСБ, абавязаны былі скончыць праверку рэалізацыі ўзятых абавязкаў па калдагаварох.

На прадпрыемствах **Віцебску** выяўлена, што рад гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый ня толькі не правялі праверкі калдагавароў, але не афармілі і заключэньня іх (цагельні камунальнага трэсту і інш.). Парт'ячэйка дрожжаводу ўвесь час адцягвае работу па праверцы.

На радзе фабрык і заводаў на першым этапе кампаніі праверачнымі брыгадамі было ахоплена звыш 50 проц. рабочых (акулярная фабрыка, лесазавод імя «Правды», сьпіртзавод і інш.). Аднак, вопыт работы гэтых прадпрыемстваў не падхоплены прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі.

Ня выкананы ўзятыя па калдагаворы абавязкі па ахове працы на фабрыках «Сьцяг індустрыялізацыі», голкавай, прадпрыемствах крамтрэсту і інш. Есьць выпадкі бюракратычных адносін да забесьпячэньня рабочых спэцхарчаваньнем. На заводзе **«Камінтэрн»** (ліцейным цэху), акулярнай фабрыцы (шліфавальным цэху), на заводзе «Чырвоны мэталіст», голкавай фабрыцы і «Дзьвіне», не абсталяваны сталоўкі, выдаюць малако дрэннай якасьці (кіслае) і г. д.

У сувязі з тым, што рад буйнейшых прадпрыемстваў былі ў адпачынку, праверка калдагавароў працягнута да 10 жніўня.

Да праверкі трэба прыцягнуць усю грамадзкасьць прадпрыемстваў. Разгортваньнем самакрытыкі забясьпечыць выкананьне кожнага пункту калдагавору, ажыцьцяўленьне кожнай прапановы рабочых, дабіваючыся выкананьня ўзятых гаспадарчымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі абавязкаў па паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых (адкрыцьцё сталовак, укамплектаваньне сьвінарнікаў, трусатнікаў, скончэньне ў тэрмін жыльлёвага будаўніцтва, адкрыцьцё пляцовак, дзіцячых садоў і г. д.). Неабходна паставіць у цэнтры ўвагі прафарганізацый пытаньне ліквідацыі ўраўнілаўкі, правільнага скарыстаньня фонду зарплаты.

Разумаў.

Плян мытнага аб'яднаньня супроць СССР

ПАРЫЖ, 5. «Эформасіон» друкуе «ў парадку абмеркаваньня» артыкул Жорка-дэ-Кастэльян, які **высоўвае праект мытнага аб'яднаньня Эўропы з уключэньнем Англіі.** Праект Кастэльяна зводзіцца да наступных пунктаў: 1) скасаваньне гандлёвых абмежаваньняў, 2) распаўсюджаньне на ўсю Эўропу, за выключэньнем СССР, прэфэрэнцыяльнага рэжыму, 3) устанаўленьне вышэйшых межаў у разьмеры 30 проц. для мытаў паміж эўрапэйскімі краінамі, 4) увядзеньне карных мер супроць дэмпінгаў усіх форм, 5) стварэньне эўрапэйскай арбітражнай камісіі для нагляду за выкананьнем дагавору і вырашэньня канфліктаў. Гаворачы аб адносінах да СССР, Кастэльян растлумачвае: **«СССР павінен застацца па-за аб'яднаньнем** па таму, што хто-небудзь хоча дзейнічаць супроць яго, а таму што ён асаблівы кантынгент з асаблівай сыстэмай гандлю».

Вайна паміж Балівіяй і Парагваем

ВАШЫНГТОН. Прадстаўнікамі 19 «нэйтральных» дзяржаў Амэрыкі на чале з ПАЗШ адпраўлена нота ідэйнічнага зьместу Балівіі і Парагваю, якая заклікае да мірнага ўрэгуляваньня канфлікту.

У ноце ўказваецца, што амэрыканскія дзяржавы адмовяцца прызнаць якія-б там ні было тэрытарыяльныя зьмены ў спрэчным раёне **Чако,** якія былі зроблены пры дапамозе заваяваньня. (Гэта заява нагадвае рапейшыя дэклярацыі Стымсона па нытаньні аб Манчжурыі).

Парагвайскі ўрад паведаміў Лігу нацый, што Парагвай гатоў прыняць яго пасярэдніцтва. Урад Балівіі адправіў Лізе нацый двухсэнсоўную заяву, у якой указвае, што Балівія не адмаўляецца ад мірнага ўрэгуляваньня канфлікту.

Фабрыканты фальшывак і іх заказчыкі

БЭРЛІН. 8 жніўня ў Бэрліне пачынаецца суд **над арыштаванымі два месяцы назад фабрыкантамі антысавецкіх палітычных фальшывак — белагвардзейцамі Абдул хан Афшарам і Елагіным.**

Як відома, Афшар і Елагін па працягу году прадавалі шматлікім бэрлінскім прадстаўніцтвам чужаземных дзяржаў розныя «дакуманты». На судзе сьведкамі будуць выступаць шматлікія чужаземныя дыпляматы, якія карысталіся паслугамі Абдул хан Афшара і Елагіна.

Характэрна, што абарона зыходзіць з цьверджаньня, што прадстаўнікі чужаземных дзяржаў, якія куплялі ў Афшара і Елагіна славутыя «дакуманты», ведалі, што гэтыя «дакуманты» зьяўляюцца фальшывымі. Паводле даных абароны, адзін з бэрлінскіх дыпляматычных прадстаўнікоў заявіў Афшару пры пакупцы некаторых «дакумантаў», што калі Афшар прыпісе імённа сапраўдныя дакуманты, а не фальшыўкі, дык яму за іх будзе заплачана значна даражэй.

Японская авіяцыя бамбардыруе кітайскія часьці

ТОКІЁ, 5. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе з Мукдэну, што ў сувязі з абвастрэньнем становішча ў раёнах Хайчэну (пункт на Паўднёва-Мукдэнскай чыгунцы, на поўдзень ад Мукдэну) і Інкоу (порт у Ляодунскай затоцы), сёньня ў Мукдэне адбылася нарада пры ўдзеле Меры (начальнік аховы Паўднёва-Мукдэнскай чыгункі) і другіх японскіх лідэраў для абгаварэньня мер у адпаведнасьці з «катэгарычнымі інструкцыямі», атрыманымі з Токіё «аб расправе з «парушальнікамі парадку».

Японская авіяцыя бамбардавала «атрады Чжан Сюэ-ляна» ў раёне Янхутуну (на захад ад вузлавой станцыі на Мукдэн-Шанхайгуаньскай чыгунцы — Гоўбанцзы).

Папраўка

У «Зьвязьдзе» ад 6 жніўня ў артыкуле «Два юбілеі» дапушчаны скажэньні. Апошнюю фразу трэцяга абзацу першай калёнкі трэба чытаць: **«Наш друк насірозь рэвалюцыйны, бо ім кіруе камуністычная партыя — авангард да канца рэвалюцыйнай клясы — пралетарыят».**

Другую фразу ў другім абзацы, шостай калёнцы трэба чытаць: **«У сярэднім на кожную пяцідзённую цяпер прыпадае звыш ста з лішнім рабселькораўскіх лістоў. За 1932 г. рух рабочых лістоў (без матар'ялаў уласных карэспандэнтаў і рэйдаўскіх матар'ялаў) прадстаўляецца ў наступным выглядзе.**

У той-жа калёнцы ў апошнім абзацы ў зводцы напісана: **«1933 г.»,** павінна быць— **«1932 год».**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Аргінстр ЦК КП(б)Б прапануе **т. Сярдзюкову** (працаваў у г. Рэчыцы на заводзе імя Х Кастрычніка) тэрмінова зайсьці ў аргінстр да тав. Гурэвіча. Просьба да ўсіх арганізацый, якія ведаюць месцазнаходжаньне тав. Сярдзюкова, тэлеграфна паведаміць яго адрас.

Аргінстр ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Правілы прыёму ва ўсебеларускі палітыка-асьветны інстытут на 1932-33 навучальны год.

(Асобны прыём)

1. Палітыка-асьветны інстытут мае мэту падрыхтаваць палітасьветных работнікаў з вышэйшай кваліфікацыяй па асобных галінах палітасьветнай работы (раённыя інструктары і інспэктары палітасьветнай работы, загадчыкі палітасьветустаноў, супрацоўнікі навуковых бібліятэк, музэяў і інш., сакратары раённых газэт).

У адпаведнасьці з гэтым пры інстытуце існуюць спэцыяльныя аддзяленьні:
1) арганізацыйна-інструктарскае,
2) бібліятэчна інструктарскае,
8) масава-інструктарскае,
4) газэтнае.

2. На першы курс бяз іспытаў прымаюцца асобы, якія маюць закончаную сярэднюю асьвету а таксама і тыя, што скончылі курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВТНУ.

Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме ведаў сярэдняй школы (9-цігодкі).

3. У палітыка-асьветны інстытут на аддзяленьні: газэтнае, арганізацыйна-інструктарскае і масавай палітыка-асьветнай работы прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б і КСМ, якія маюць ня менш, як двухгадовы стаж актыўнай партыйнай, камсамольскай або грамадзкай работы.

Па бібліятэчнае аддзяленьне прымаюцца і беспартыйныя з 2-гадовым стажам грамадзкай работы.

Узрост паступаючых ад 17 да 35 год.

У інстытут ня прымаюцца асобы з заразьлівымі хваробамі, хворыя неўрастэніяй у клінічнай форме, сухотамі і зусім фізычна слабыя.

4. Паступаючыя ў палітыка-асьветны інстытут павінны падаць на імя раённых і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП(б)Б, заяву з указаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы: 1) аб узросьце, 2) адносінах да службы ў Чырвонай арміі, 3) аб асьвеце, 4) аб стане здароўя, 5) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6) для адпаведнага—адпаведны дакумант аб сельгаспадатку на 1932 г., 7) даведку аб двухгадовым стажы для асоб, скончыўшых тэхнікумы і ФЗВ), 8) характарыстыку мясцовай партыйнай або камсамольскай ячэйкі, 9) анкету, засьведчаную савецкімі або прафэсыянальнымі ўстановамі і арганізацыямі раённага маштабу, 10) 2 фатаграфічныя карткі.

Дакументы аб асьвеце дасылаюцца толькі ў арыгіналах; формы анкеты тыя-ж, як і для ўсіх вышэйшых навучальных устаноў.

Тэрмін пасылкі дакумантаў з камандыроўкамі ў інстытут 15 жніўня па адрасе: Магілёў, Камсамольская, 28.

5. Тыя асобы, якія камандыруюцца ў палітасьветны інстытут, забясьпечваюцца мясцовымі арганізацыямі сродкамі і апрача таго, работнікам павінна быць выдана пэнсія за два тыдні ўперад. За незалічанымі захоўваецца пасада, якую яны займалі раней.

6. Залічаныя студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй па вызначаных нормах, падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

Студэнты павінны мець свае пасьцельныя прылады. Інстытут не забясьпечвае кватэрамі сем'і студэнтаў.

Заняткі на першым курсе пачынаюцца 1-га кастрычніка.

7. Раёны камандыруюць: Менскі Віцебскі, Гомельскі і Магілёўскі па менш чым па 6 чал., астатнія раёны—ня менш чым па 4 чал.

Дырэкцыя Інстытуту.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА

ўсіх зацікаўленых арганізацый і ўстаноў, што пачала функцыянаваць Беларуская Рэспубліканская кантора па збыту прадукцыі швэйнай прамысловасьці

„САЮЗШВЭЙЗБЫТ"

з базамі, якія знаходзяцца на гасразьліку і самастойных балянсах, у гарадох:

у Менску пры швэйн. фабрыцы „Кастрычнік" к.-к. рах. у Менскім Аддз. Дзяржбанку № 48-102898;

у Віцебску пры швэйн. фабрыцы „Сьцяг індустр." к.-к. рах. у Віцебскім Аддз. Дзяржбанку № 48-1731;

у Гомелі пры швэйн. фабрыцы „Камінтэрн" к.-к. рах. у Гомельск. Аддз. Дзяржбанку № 48-847;

у Магілеве пры швэйн. фабрыцы „Валадарскага" к.-к. рах. у Магілёўск. Аддз. Дзяржбанку № 48-1347;

у Бабруйску пры швэйн. фабрыцы „Дзяржынскага" к.-к. рах. у Бабруйск. Аддз. Дзяржбанку № 48-13037.

Адрас Беларускай Рэспубліканскай К-ры „Саюзшвэйзбыт"—г. Менск, Ленінская вул., № 15 к.-к. рахунак ва Усебеларускай К-ры Дзяржбанку № 48-3212. Тэлефоны № 6-39 і 7-58.

Беларуская Рэспубліканская К-ра „Саюзшвэйзбыт"

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН"
Сёньня і штодзённа
5-ы цыкль 5-ы цыкль
„МЮЗІК-ХОЛ"
Пачатак у 9 гадз. вечара.

Сёньня. 8 жніўня, у 7 гадзін веч. у памяшканьні рэдакцыі газэты „Зьвязда" адбудзецца
АДКРЫТЫ АГУЛЬНЫ СХОД
ПАРТКАЛЬКТЫВУ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ
з парадкам дня:
Даклад аб юбілею газэты „ЗЬВЯЗДА"
Яўка ўсіх партыйцаў абавязкова. Запрашаюцца і беспартыйныя.

„Чырвоная Зорка" — Сёньня і штодзённа Пуцёўка ў жыцьцё
„Інтэрнацыянал" — Весёлая амэрыканская камэдыя ХРЫЗАНТЭМА. Звыш програм. хроніка Саюзкіно.
Кіно „Пралетары" — Мастацкі фільм ЗА МАНАСТЫРСКАЙ СЬЦЯНОЙ у 7 частках. Дзённыя дзіцячыя сэансы мастацкі фільм ІХНЯЯ ВУЛІЦА.
„СПАРТАК" Пач.: 6-30, 8, 9-30, 11 г. Каса—з 5 г. — Мастацкі фільм 1-ая серыя МІС-МЭНД у 7 частках.

8 жніўня, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні Менгарпрафсавету (пляц Волі, 2-гі паверх, пакой № 1)
СКЛІКАЕЦЦА
ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ
Менскага гарадзкога савету прафэсыянальных саюзаў
З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
1) Вынікі сэсіі, ход праполкі і ўборкі (даклады Гарсавету і Белсельгасаб'яднаньня).
2) Вынікі сталінскага паходу, разгортваньне савецкага калгаснага гандлю і шырспажыў (даклады МенГСПС, Гарснабу, Мэталяаб'яднаньня і Шэйнаб'яднаньня).
3) Вынікі выкананьня прамфінплану за 1-е паўгодзьдзе і масавая работа ніззвога праф. зьвяна (даклады вытворч. сэкт. Мен. ГСПС, ФЗМК зав імя Варашылава, „Большавік", дзпо МБВ чыг.).
Яўка членаў пленуму і рэўізмісіі абавязкова.
Запрашаюцца старшыні ФЗМК, ГК, рабфакомаў прафарганізатары.
Старшыня МенГСПС ШУЛЬКІН.

Прадасьця-рога абавязтам Менскай электрастанцыі.
У апошнія дні ў горадзе натыкаюцца выпадкі, што да абанэнтаў выяўляюцца невядомыя асобы пад відам кантрапёраў электрастанцыі, пасьля ўходу якіх выяўляецца прапажа тых ці іншых рэчаў.
Электрастанцыя папярэджвае, што ад усіх асоб, якія зьяўляюцца да абанэнтаў ад яе імя, неабходна патрабаваць пасьведчаньне асобы з фатаграфічнай карткай прадпрыемства і пячаткаю Менскай гарадзкой электрастанцыі.
Асоб, якія ня маюць пазначаных пасьведчаньняў, затрымліваць і накіроўваць у крымінальны вышук.
Электрастанцыя.

Прадаецца дом
з 2-х кватэр і бравенчаты сарай, даўн. у 18 сакр. Бачыць ад 6 да 8 гадз. вечара—рог Мопраўскай і Крапоткіна, д. № 11, кв. 2.

МАЦУЙЦЕ АБАРОНУ СССР
набывайце білеты імя 3 ПЛЕНУМУ ЦС АСОАВІЯХІМУ
Ад жніўня месяца Асоавіяхім прыступае да рэалізацыі 2.000.000 білетаў, коштам па 3 р., спэцыяльнага выпуску імя 3 пленуму ЦС Саюзу Асоавіяхіму СССР.
У фонд абароны краіны будзе ўкладзена 6.000.000 р.
Разыгрываецца 20.000 выйгрышаў на суму 960.000 р.
ГАЛОЎНЫЯ ВЫИГРЫШЫ:

5 выйгрышаў	па	10.000 р.	Падарожжа вакол сьвету тэрмінам на 4 месяцы.
15	„	5.000 „	Падарожжа вакол сьвету тэрмінам на 2 месяцы.
35	„	3.000 „	Падарожжа па Эўропе тэрмінам на адзін з паловаю месяцы.
45	„	1.000 „	Падарожжа па Эўропе тэрмінам на 1 месяц.
100	„	500 „	Пальто на сомялеце па СССР на працягу 15 дзён.
300	„	200 „	Вэлясіпэд, скуранае або цёплае паліто—па вы